Камуністычная партыя (бальшавікоў) Беларусі

ЗЬВЯЗДА

Орган Цэнтральнага і Менскага Камітэтаў КП(б)Б

КРАСАВІК 9 1933 г. № 78 (4622)

Год выданьня XVI

Пралетары ўсіх краёў, злучайцеся!

ПАВЕДАМЛЕНЬНЕ ТАСС

У сувязі з заяўленьнем 3-га красавіка г. г. тав. **Літвінавым** ад імя савецкага ўраду пратэсту, германскі пасол п. Дырксэн паведаў 8 красавіка тав. **Літвінава** і па даручэньні свайго ўраду паведаміў яму, што германскім урадам расьсьледуюцца паведамленьні савецкім паўнамоцным прадстаўніцтвам выпадкі незаконнага арышту савецкіх грамадзян і дрэнных абыходжаньняў з імі, і што германскі ўрад патурбуецца аб бесперашкоднай рабоце савецкіх гаспадарчых арганізацый у Германіі ў адпаведнасьці з існуючымі пагаворамі.

З прычыны выказанай пры гэтым п. Дырксэнам надзеі, што савецкія гаспадарчыя арганізацыі спыняць сувязь з германскай камуністычнай партыяй, з спасылкай на наяўнасьць сярод германскіх служачых т-ва «Дэрэп» значнага процанту камуністаў, — тав. **Літвінаў** заявіў, што савецкія гаспадарчыя арганізацыі ніколі ніякіх зносін з германскімі палітычнымі партыямі, у тым ліку з камуністычнай, ня мелі, строга ўстрымоўваючыся ад усякага ўмяшаньня ва ўнутраныя справы Германіі, што дапушчэньне аб працёўным не адпавядае сапраўднасьці, ні на чым не абгрунтавана і ня можа быць пацьверджана ніякімі данымі, і што гэтыя арганізацыі таксама ня могуць несьці адказнасьці за прыватную палітычную дзейнасьць сваіх служачых, як нямецкія арганізацыі і камэрцыйныя фірмы, у якіх працуюць члены германскай камуністычнай партыі.

НЕ ЗАПАЛОХАЮЦЬ

Як толькі ангельская дыплёматыя атрымала паведамленьне аб арышце групы ангельскіх інжынэраў у СССР, зараз-жа была пушчана ў ход уся сыстэма пагроз і запалохваньняў. Ня ведаючы яшчэ ў чым абвінавачваюцца арыштаваныя, ня ведаючы, на што атпраецца абвінавачаньне, ангельская дыплёматыя лічыла магчымым выступіць са сьмехатворным тэкстам аб немагчымасьці іх віноўнасьці. Яна адразу высунула патрабаваньне аб вызваленьні абвінавачаных, аб адмаўленьні ад суда пад імі. Буржуазная ангельская газэта «Манчэстэр гардыян» пісала 31 сакавіка наконт гэтых патрабаваньняў: «Якое-б ні было наша перакананьне ў нявінасьці арыштаваных, як-бы мы не падазравалі матывы і мэтады прафсьледаваньня, немагчыма абаранаць прынцып, паводле якога брытанскія грамадзяне ў Расіі нядольны парушыць рускія законы. Мы не дапусьцілі-б такога прынцыпу ў адносінах да чужаземцаў у нашай краіне, як-бы мы не паважалі і шанцю і мы ня можам чакаць, што гэты прынцып будзе кім-небудзь прыняты. Ні ў Расіі, ні ў якой-небудзь іншай краіне, з якой мы знаходзімся ў роўнапраўных адносінах, мы ня можам патрабаваць пераваг пакінуталі дапушчэньня тут ангельскіх адвакатаў, бо і мы не зрабілі-б такіх уступак чужаземцам. Бескарысна патрабаваць ад пасьлежнай сучаснай дзяржавы, каб яна адмаўлялася ад абвіна вачэньня, калі мы самі падобныя патрабаваньні, прад'яўленыя нам, лічылі-б афронтам, які прымушаў-бы нас прадпрыняць нашу палітыку ўсякай цаной. Усё гэта прадстаўляе забітае месца міжнароднай палітыкі».

Мы ня будзем паўтараць і ўпрыгожваць гэтыя зьбітыя месцы. Савецкі ўрад даў на дыплёматычныя пагрозы варты адказ, заявіўшы, што суд адбудзецца і што Савецкі саюз не дазволіць нікому ўкшваць у адносінах да сабе мэтады, якія дазваляюць сабе імпэрыялістычныя краіны ў адносінах да калёній, карыстаючыся іх безабаронасьцю. Перакананьнем, што савецкі ўрад ня ўступіць пад націскам дыплёматычных пагроз і шаленства ангельскага імпэрыялізму, ангельскія імпэрыялісты паранылі ўжываць пагрозы, канкрэтызуючы іх. Пастанова ангельскага парляманту, прынятая пасьлерак пратэсту дэпутатаў лейбарыцкай партыі і прадастаўляючая ўраду паўнамоцтвы забараніць у выпадку неабходнасьці ўвоз савецкіх тавараў пасьля 18 красавіка (17 красавіка канчаецца тэрмін ранейшага пагавору), прадстаўляе сабой пагрозу матар'яльнай страты Савецкаму саюзу, калі ён не пачнецца выкананьнем ангельскага імпэрыялізму. Прадстаўнікі ангельскага ўраду і частка ангельскай прэсы прабуюць замаскаваць характар гэтай пагрозы, сьцьвярджаючы аб сваёй надзеі, што гэтыя мерапрыемствы ня прыведуць дастасаваньню, і адмаўляючы, што справа тут ідзе аб пасяганьні на права савецкага ўраду прыцягваць да судовай адказнасьці парушальнікаў савецкіх законаў. Гэтыя спробы не затушуюць становішча. Факт у нязгодзе, што ад савецкага ўраду патрабуюць адмаўленьня ад прыцягненьня да суда людзей, якіх ён лічыць вінаватымі, пераражаючы ў адваротным выпадку матар'яльнай стратай. Натхняцелі гэтага рашэньня памыляцца ў сваіх разьлёках. Рабочая клясa і сялянства Савецкага саюзу не для таго скінулі ўладу рускіх паме шчыкаў і капіталістаў, каб дазволіць гаспадарыць на савецкай тэрыторыі чужаземным капіталістам, не для таго, каб дазволіць чужаземным імпэрыялістам урагам дыктаваць законы краіне Савецкаў.

Такога роду пагрозы з боку ангельскіх імпэрыялістаў нямінуча паводзяць на пытаньне, чаму яны так стараюцца. Быць моха, яны ведаюць больш аб гэтай справе, чым вядома грамадзкай думцы іх краіны, быць моха, яны баяцца, што суд укарыстаюць такія бакі, аб якіх яшчэ невядома.

Ва ўсякім выпадку гэтыя пагрозы кідаюць яркае сьвятло на характар замежнай палітыкі ангельскага імпэрыялізму. Ангельскі ўрад належыць да ініцыятараў спляжаньня міжнароднай эканамічнай канфэрэнцыі, задача якой—намеціць сродкі для ажыўленьня сусьветнай гаспадаркі. «Аднаўленцы» сусьветнай гаспадаркі даюць дасканалы прыклад вырашэньня міжнародных эканамічных сувязяй. Яны ма тыўлюць сваю пагрозу савецка-ангельскаму гандлю сьцьвярджэньнем, што нельга весьці гандлёвыя справы пры адсутнасьці пэўных юрыдычных гарантый. Але гэты аргумант б'е іменна па іх, бо яны дабіваюцца, каб Савецкі саюз адмовіўся ад судовага сьледзтва і судовага прыгавору і каб ён вызваляў людзей, якіх лічыць вінаватымі ў парушэньні сваіх законаў. Калі хто і мае права гаварыць аб вы рашэньні ўмоў міжнароднага гандлю, то іменна наша краіна, якая можа прад'явіць гэта абвінавачаньне ангельскаму імпэрыялізму. Ніякі сур'ёзны гандаль немагчымы, калі пануючая кляса Англіі будзе дазваляць са бе зварачацца да пагроз разарваньня гандлёвых адносін з поваду інцыдэнтаў, якія магчымы заўсёды, калі справа ідзе аб рабоце чужаземцаў на чужой ім тэрыторыі, а тым больш, калі справа ідзе аб эканамічных адносінах розных спэцыяльных сыстэм. Просты факт, што Савецкі саюз мае справу з тысячамі чужаземных інжынэраў і што прыходзіцца зварачацца да судовых дзеяньняў толькі ў выключных выпадках, паказвае, што тут і гутаркі ня можа быць аб злой волі з савецкага боку. У такім выпадку пагрозы з боку ангельскіх імпэрыялістаў паказваюць, як сур'ёзна адносяцца гэтыя паны да стварэньня ўмоў для ажыўленьня міжнародных эканамічных адносін.

Паны ангельскія імпэрыялісты выступаюць у ролі міжнародных мірастворцаў. Яны вучаць другія краіны, як трэба шукаць мірнага вырашэньня канфліктаў, як трэба нагнетаць рэпазаваць даўгавары, якія выклікаюць незадавальненьне другіх нацый. Адначасова ангельскія імпэрыялісты пагражаюць на справе эканамічным байкотам нялікай крапіве ня з поваду парушэньня міжнародных дагавораў, а з поваду прыстасаваньня законаў гэтай краіны супроць людзей, якіх яна абвінавачвае ў злачынстве.

Неадпаведнасьць прадмету канфлікту і мерапрыемстваў ангельскага імпэрыялізму настолькі яркая, настолькі кідаецца ў вочы, што паўстае пытаньне аб больш глыбокіх прычынах, выклікаўшых такія паводзіны ангельскага імпэрыялізму. Мы яшчэ вернем ся да гэтых прычын у далейшым. Сёньня мы толькі скажам, што не ангельскія міністры будуць вырашаць, як павінны дастасоўвацца законы ў Савецкім саюзе, гэта вырашае і будзе вырашаць урад Савецкага саюзу. Колькі-б ні пагражалі ангельскія імпэрыялісты, іх пагрозы ня будуць мець ніякага ўплыву на савецкі суд. Савецкі суд будзе судзіць выключна на аснове матар'ялаў сьледзтва аб вінаватасьці або нявінаватасьці абвінавачаных і вынесе тое прыгавор, якога патрабуе савецкі закон. Адзіны вынік пагроз ангельскіх імпэрыялістаў будзе заключацца ў тым, што рабочая кляса і сялянства Савецкага саюзу яшчэ раз убачаць, чаго варты мірныя запэўненьні і дружалюбныя словы ангельскай дыплёматыі. Ангельскія імпэрыялісты прадэманстравалі яшчэ раз, што яны не адмовіліся ад жаданьня камандаваць і загадваць на савецкай тэрыторыі. Гэта запамятаюць народныя масы Савецкага саюзу. Ангельскі ўрад і парлямант ангельскага імпэрыялізму выказаліся. Цяпер чарга за савецкім судом. Ён спакойна вынесе свой прысуд.

Хто-ж больш пацерпіць ад ажыцьцяўленьня пагроз—Англія ці Савецкі саюз—паказа будучае («Известия»).

Урачыстае пасяджэньне калегіі Наркамасьветы РСФСР, прысьвечанае юбілею А. С Бубнова

МАСКВА, 7. Учора ў клюбе Наркамасьветы РСФСР адбылося адкрытае ўрачыстае пасяджэньне калегіі наркамату, прысьвечанае юбілею тав. А. С. БУБНОВА.

Адкрываючы пасяджэньне, т. КРЖЫЖАНОЎСКІ горача вітаў юбіляра з 50-годзьдзем са дня нараджэньня і 30-годзьдзем бальшавіцкай рэвалюцыйнай дзейнасьці.

Першымі віталі А. С. БУБНОВА яго старыя таварышы па падпольні па рэвалюцыі 1905 году — ІВАНАЎСКІЯ БАЛЬШАВІКІ т.т. СЕДАЎ (ад філіялу таварыства старых бальшавікоў Іванаўскай вобласьці), НОЛЬКАЎ (ад Іванаўскага абвыканкому) і БЕЗЕНАВА (работніца Нова-Іванаўскай мануфактуры імя тав. Бубнова). Апошняя ад імя ўсіх рабочых і работніц мануфактуры ўручыла тав. Бубнову значэк ударніка. Яна заявіла, што рабочыя дзякуюць урад РСФСР, які задаволіў іх хадайніцтва аб прысваеньні мануфактуры імя тав. Бубнова і абавязваюцца высока несьці гэта імя.

Усе выступаўшыя потым таварышы аднадушна падкрэсьлівалі нястомную ліпучую энэргію А. С. Бубнова, энэргію, падмацаваную вялікім і плённым вопытам барацьбы, і жадалі, каб сіла і дзяйсрасьць, якімі адзначана яго цяперашняя работа, не пакідалі яго яшчэ многія гады.

Пасьля віталі тав. А. С. Бубнова прадстаўнікі маскоўскіх рабочых.

У адказным слове тав. А. С. БУБНОЎ, спатканы доўга незмаўкаўшымі апладысмэнтамі, сказаў:

«Усе вашы прывітаньні, усе віншаваньні пралетарскіх арганізацый і пасобных таварышоў па рэвалюцыйнай барацьбе і рабоце я прымаю з найвялікшай удзячнасьцю, як наказ да далейшай работы, абавязваючы з удзесяцеранай энэргіяй змагацца за пралетарскую рэвалюцыю, за сацыялістычнае будаўніцтва. Так разумею юбілейныя прывітаньні старая бальшавіцкая гвардыя і я абавязваюся цьвёрда і дакладна сьледаваць гэтаму бальшавіцкаму закону, якому вучыў нас ЛЕНІН, якому вучыць нас тав. СТАЛІН. Я шчасьлівы, што на працягу ўсіх гадоў майго сьвядомага жыцьця рэвалюцыянэра мне давялося ісьці ў стапёвых радох ленінскай партыі. Я ганаруся тым, што маімі настаўнікамі марксызму-ленінізму і мастацтва пралетарскай рэвалюцыі былі перадавыя рэвалюцыйныя рабочыя — Іванаўская партарганізацыя.

НЯХАЙ ЖЫВЕ ВЯЛІКАЯ ПАРТЫЯ БАЛЬШАВІКОЎ І ЯЕ ЛЕНІНСКІ ЦК НА ЧАЛЕ З ТАВ. СТАЛІНЫМ!»

ПЯЦІДЗЕНЬНІК ПРАВЕРКІ ПАДРЫХТОЎКІ КААПГАСАЎ ДА СЯЎБЫ

ПА ПРЫКЛАДУ КААПГАСАЎ ФАБРЫКІ „ВЭЗУВІ" І ГОМЕЛЬСКАГА ЧЫГУНАЧНАГА ВУЗЛА УДАРНЫМІ ТЭМПАМІ РЫХТАВАЦЦА ДА ВЯСНЫ

УМОВЫ АДНОЛЬКАВЫЯ, ВЫНІКІ РОЗНЫЯ

ГОМЕЛЬ. (Наш кар.).

У бліжэйшыя дні прыгарадныя гаспадаркі павінны пачаць веснавую сяўбу. Як-жа падрыхтаваліся каапгасы Гомельшчыны да вырашэньня адказнейшай задачы, якая стаіць перад імі?

Прыклад ударнай работы паказала фэрма **Гомельскага чыгуначнага вузла.** Вывезена 8.015 тон гною пры заданьні ў 8 тыс. Рабочыя **Шаранкоў, Сокалаў, Перакладнёў і Лапшын** пабаявому працавалі на вывазцы гною.

Падрыхтован інвэнтар, які поўнасьцю прымацован да брыгад. Са 119 коняй лёгка хворых толькі 3. Даглядаюць коняй лепшыя ўдарнікі каапгасу, якія атраўдалі сябе на рабоце **—Піліпаў, Пацюк, Сявэрын і Захарэнка.** Вызначаныя паводле пляну 670 раньніх парніковых рам поўнасьцю закладзены. Канчаецца закладка 400 позьніх рам.

Нядаўна «Зьвязда» паведамляла аб дрэнным падрыхтоўцы да сяўбы прыгараднай гаспадаркі фабрыкі **«Вэзувіі».** Гэты каапгас за апошнія дні дабіўся вялікага зруху. Плян вывазкі гною выкананы на 100,7 проц. Інвэнтар поўнасьцю адрамонтован і прымацован да брыгад. Пробны выезд у поле паказаў гатоўнасьць каапгасу да сяўбы. Па-ўдарнаму працуюць брыгады т. т. **Галунова і Чыкунова.**

Іншы малюнак мы назіраем у каапгасах заводу **Гомсельмаш і Палесдруку.**

У гаспадарцы заводу Гомсельмаш не хапае 78 цэнтн. збожжавых, 86 тон бульбы. Для правядзеньня сяўбы патрэбен 51 конь, ёсьць 46, прычым 10 коняй непрыгодны да работы — яны загнаны, выйшлі са строю. Няма людзей, адказных за догляд коняй, няма ў стайні гаспадарчага вока.

Поўны самацёк мы маем у наборы рабочай сілы.

Каапгас Палесдруку вывез замест 1.480 тон гною толькі 607. Не хапае 20 цэнтн. аўса і 76 тон бульбы. 22 коні выйшлі са строю і патрабуюць доўгатэрміновага адпачынку.

Атыднае становішча цягавай сілы тлу мачыцца тым, што догляд коняй быў даручан кулаку Арлову, які быў вычышчан з калгасу, і Лысаву, які нядаўна вярнуўся са ссылкі. Інвэнтар, калёсы, збруя да коняй не прымацава ны. На сёньнішні дзень не хапае 12 бораў, 10 акучнікаў і 3 гародных сявярак.

Вельмі дрэнна ідзе закладка парнікоў: закладзена 15 замест 50. Дырэктар гаспадаркі Крымскі і кіраўніцтва Палесдруку (Лейбін, Штуцін і Майзельс) ніякай увагі не аддаюць каапгасу.

Амаль такое-ж становішча па каапгасах фабрыкі «Спартак» і заводу «Пралетары». Ня складены вытворчыя пляны. Гной поўнасьцю ня вывезен. Не хапае цягавай сілы.

Гарком партыі і гарсавет павінны неадкладна прыняць усе меры, каб дапамагчы каапгасам у падрыхтоўцы да сяўбы, бо часу засталося вельмі мала.

Папярэдні.

НАСЕНЬНЕ БУЛЬБЫ—КААПГАСАМ

Раньняя і позьняя бульба складае амаль палову пляну сяўбы гародніны і кармовых культур у каапгасах БССР. Гэта важнейшая культура каапгасаў. Аднак, забесьпячэньне прыгарадных гаспадарак насеннай бульбай далёка не адпавядае тэй вялізарнай ролі, якая адведзена ёй у пасеўных плянах. Каапгасам патрэбна 6.125 тон позьняй насеннай бульбы, ёсьць 5.600 тон—91 проц. Раньняй бульбы замест 2.587 тон ёсьць каля 1.000—прыкладна 40 проц.

Прыведзеныя лічбы сьведчаць аб дрэнным становішчы на вучастку сяўбы раньняй бульбы.

Толькі ў другой палове сакавіка Белкаапсаюз і каапгасы ўсхамянуліся, што не хапае насеннай бульбы. Тады сельгаскіраўніцтва БКС прыступіла да арганізацыі дэцэнтралізаваных заготовак у раёнах БССР. Каапгасы, аднак, за рэдкімі выключэньнямі, ня ўключыліся ў гэту работу. Кіраўнікі прыгарадных гаспадарак спадзяваліся на цэнтралізаванае снабжэньне: «Нічога, дадуць, калі ня хопіць уласнай бульбы. Нас без насеньня не пакінуць».

Утрыманчыя тэндэнцыі зьявіліся асноўнай прычынай дрэнных вынікаў заготовак. Заготоўлена толькі 400 тон.

Найбольш адстаюць буйныя прадпрыемствы БССР. Нічога не зрабіла віцебская трыкатажная фабрыка імя К. Цэткін і швэйная «Прафінтэрн». Між тым каапгасы гэтых прадпрыемстваў забясьпечаны насеннай бульбай толькі на 30 проц. Прыкладна такое-ж становішча ў Гомелі. Нічога не заготовіў каапгас менскіх будаўнікоў.

Пасланыя ў раёны заготоўшчыкі не праўляюць патрэбнай актыўнасьці і настойлівасьці. Яны абмяжоўваюцца перадачай нарадаў райзагам і на гэтым лічаць сваю місію скончанай.

Трэба адзначыць бязьдзейнасьць ра ду райзагаў, якія павінны арганізаваць заготоўкі і выканаць нарады. Уся колькасьць насеньня павінна быць заготоўлена ў 13 раёнах. Між тым у 7 раёнах (Заслаўскім, Лагойскім, Сурасскім, Вузьдзенскім і інш.) дагэтуль не заготоўлена ні адной тоны. Гэта вынік ігнараваньня райзагамі заготовак насеннай бульбы для прыгарадных гаспадарак.

Патрэбны самыя рашучыя меры, каб забясьпечыць каапгасы насеннай бульбай. Заводзкія заготоўчыкі павінны максымальна актывізаваць сваю работу. Асаблівую ўвагу трэба аддаць пераборцы бульбы, каб адсартаваць добрую раньнюю бульбу. Гэта абавязан рабіць кожны каапгас.

Белкаапсаюз павінен узьдзейнічаць на райзагаў, якія зрываюць заготоўкі насеннага матар'ялу для прыгарадных гаспадарак.

Ф. Л.

Пра ход падрыхтоўкі да сяўбы ў Менскім племсаўгастрэсьце

Пастанова ЦК КП(б)Б і СНК БССР

ЦК і СНК канстатуюць, што Племсаўгастрэст, маючы ўсе неабходныя ўмовы для своечасовай падрыхтоўкі да сяўбы, здстае па раду вучасткаў (вывазка гною—30 проц., завоз гаручага—25 проц., адсутнасьць канкрэтных вытворчых пляноў па брыгадах, незабясьпечанасьць саўгасаў кан цэнтраванымі кармамі, несканчэньне рэмонту аднаго трактара ў саўгасе Браўчыцы).

Такое становішча ЦК і СНК тлумачаць выключна дрэнным кіраўніцтвам з боку дырэкцыі саўгасаў (Браўчыцы, Ціманава, Блонь, Райцы), адсутнасьцю канкрэтнага аперацыйнага кіраўніцтва з боку ўпаўнаважанага трэсту па БССР, слабым у рабоце.

Выходзячы з вышэйуказанага, ЦК і СНК пастанаўляюць:

1. Паставіць на від упаўнаважанаму трэсту т. Руцэйко за дапушчэньне самацёку ў рабоце і адсутнасьць канкрэтнага аперацыйнага кіраўніцтва саўгасамі. Папярэдзіць тав. Руцэйко аб неабходнасьці ў бліжэйшыя дні дабіцца рашучага пералому ў рабоце.

2. Абвясьціць суровую вымову дырэктару саўгасу Браўчыцы т. Валодзька, сакратару партячэйкі т. Нярэнскаму, кантралёру т. Урэцкаму за няпрыняцьце рашучых мер да падрыхтоўкі сяўбы (па гэтага часу 1 трактар не адрамонтован, вывезена гною 30 проц.) і папярэдзіць, што калі з іншымі арганізацыямі, сурова калі да 10 красавіка ня будзе скончана ўся работа па падрыхтоўцы да сяўбы, вывазка гною, завоз гаручага, рамонт трактараў,—яны будуць прыцягнуты да больш суровай адказнасьці.

3. Абвясьціць вымову дырэктару саўгасу Ціманава т. Філімонаву за слабую падрыхтоўку да сяўбы, вывазку гною (26 проц.), завоз гаручага (15 проц.).

4. ЦК і СНК адзначаюць, што дырэкцыяй саўгасаў ня ўсвоена асноўная задача пасеўнай кампаніі—павышэньне ўраджайнасьці, чым і тлумачыцца слабая ўвага пытаньням угнаеньня.

5. Прапанаваць, пад адказнасьць т. Руцэйко, дырэктарам саўгасаў: т. Марозава (Райцы), Валодзька (Браўчыцы), Філімонава (Ціманава), Сеялка (Блонь) забясьпечыць:

а) да 15 красавіка 1933 г. поўнасьцю вывезьці гной на поле, абавязаўшы саўгасы для гэтай мэты штодзённа скарыстоўваць ня менш 75 проц. усёй працаздольнай цягавай сілы, устанавіць 2 зьмены работы па вывазцы гною;

б) закончыць ссылку насеньня па ўсіх культурах, для чаго ў двухдзённы тэрмін перакінуць наяўныя лішкі з адных саўгасаў у другія, дзе іх не хапае, а таксама правесьці абмен ліш прытрымліваючыся засеву плошчы ў разрэзе культур, вызначаных плянам.

6. Мабілізаваць усе ўнутраныя рэсурсы для забясьпячэньня на час сяўбы цягавай сілай, канцэнтраванымі кармамі. Адначасова абавязаць тав. Сьмірнова і Загатзбоскага—т. Журомскага поўнасьцю выканаць нарады на 1 і 2 квартал 1933 г.

Завезьці гаручае згодна пляну, забясьпечваючы вывазку ўласнай тарай.

7. Распрадаваць і зацьвердзіць па ўсіх саўгасах севазварот. Прапанаваць райва (Слуцак, Талачыно, Ціманава, Горкі, Пухавічы) аказаць практычную дапамогу ў гэтых саўгасах. Упаўнаркамсаўгасаў аказаць дапамогу трэсту спэцыялістамі ва ўстанаўленьні севазвароту па племгасах.

8. Абавязаць т. Жолудава выдзеліць агранамаў для саўгасаў «Івань» і «Райцы» і зоотэхнікаў для саўгасаў «Ціманава» і «Івань».

9. Абавязаць арпанскі завод «Чырвоны барацьбіт» да 5-га скончыць адліўку кажуха дыфэра ФП для саўгасу «Браўчыцы» з тым, каб гэты саўгас па 8 поўнасьцю скончыў рамонт трактара.

10. Абавязаць упаўнаважанага ЦК і СНК т. Клябанава прадэманстраваць выкананьне гэтых дырэктыў і дапамагчы трэсту ў палепшэньні пастановкі аперацыйнасьці і канкрэтнасьці ў рабоце.

АБ ЗАВОЗЕ ГАРУЧАГА І ЗМАЗАЧНЫХ ПА МТС І САЎГАСАХ ДЛЯ ВЕСНАВОЙ ПАСЕУНАЙ КАМПАНІІ

Пастанова Народнага Камісарыяту Зямляробства БССР і ўпаўнаважанага Народнага Камісарыяту саўгасаў Саюзу ССР пры СНК БССР ад 7 красавіка 1933 году

Пастановы Цэнтрапасеўкому і СНК БССР аб скончэньні да 15 сакавіка вывазкі з нафтасклада у гаспадаркі гаручага і змазачных лімітаў лютага і сакавіка месяцаў—ня выкананы МТС і саўгасамі.

Па Наркамзему плян вывазкі гаручага на 1 красавіка выкананы на 28 проц. і 78 проц. да ёмкасьці тары.

Па Наркамсаўгасаў плян вывазкі гаручага выкананы на 23,4 проц. і да ёмкасьці тары—50 проц.

Асабліва адстаюць МТС і саўгасы наступныя:

Барысаўская МТС—плян завозу—68 тон, запоўнена тары — 48 проц.

Смалявіцкая МТС—плян завозу—152 тоны, запоўнена тары—66 проц.

Шклоўская МТС — плян завозу — 128 тон, запоўнена тары—67 проц.

Саўг. Забалоцьце — плян завозу—10 тон, запоўнена тары—40 проц.

Саўгас Смалявічы—плян завозу—30 тон, запоўнена тары—12 проц.

Саўгас Загараны—плян завозу—12,7 тон, нічога ня вывезена.

Саўгас Абрубы-Чысьціч—плян завозу —47,2 тоны, нічога ня вывезена.

Саўгас Крычаў—плян завозу—24,8 тон, нічога ня вывезена.

Саўгас Замосьце—плян завозу—20,0 тоны, нічога ня вывезена.

Выходзячы з гэтага Народны Камісарыят Зямляробства і ўпаўнаважаны Наркамсаўгасаў ПАСТАНАЎЛЯЮЦЬ:

1. За невыкананьне дырэктыў па стварэньні запасаў гаручага абвясьціць вымову дырэктарам МТС: Барысаўскай—ХОМІЧУ, Смалявіцкай—ЛЕНСКАМУ, дырэктарам саўгасаў: «Забалоцьце»—ДРОБЫШАВУ, Смалявічы—БАРАВІКУ. Суровую вымову з папярэджаньнем дырэктарам саўгасаў: Абрубы-Чысьціч—РОСЬЛІКУ, Загараны—МЕЛЬНІКАВУ, Замосьце—НОВІКУ і Крычаў—МАРКОВІКУ.

2. Прапанаваць дырэктарам МТС і саўгасаў выпучыць спэцыяльных асоб, у абавязак якіх павінна ўваходзіць:

а) распрацоўка пляну перакідні гаручага і змазачных на вучастку работ;

б) распрацоўка пляну аберочваемасьці тары, сувязь з нафтасклядам, улік выдаткаваньня гаручага і змазачных.

3. Выпучаныя асобы павінны пэрсанальна адказваць за захаванасьць гаручага, змазачных, прызначаных для трактараў.

4. Абавязаць дырэктароў МТС і саўгасаў запоўніць да 15 красавіка гаручым і змазачным усю ёмкасьць наяўнай тары, бо з 15 красавіка будзе прыступлена да браніяваньня гаручага на нафтаскладах. У выпадку знаходжаньня свабоднай пасьля 15 красавіка тары, вінаватыя будуць прыцягнуты да суровай адказнасьці.

5. Абавязаць райза сумесна з РСІ у пяцідзённы тэрмін, пачынаючы з 10 красавіка праверыць па МТС і саўгасах наяўнасьць завезенага гаручага і змазачных (газа, кіпраін, бэнзін і змазачныя); наяўнасьць тары, парадак хаваньня і інш., як гэта ўказана ў п. 2 пастановы. Увесь матар'ял аб гэтым прысылаць не пазьней 17 красавіка—па МТС і саўгасах сыстэмы Наркамзему—у Наркамзем, а па саўгасах сыстэмы Наркамсаўгасаў—у канцылярыю ўпаўнаважанага Наркамсаўгасаў (Менск, Савецкая, 70).

6. Прасіць ЦК ЛКСМБ арганізаваць з 10 па 15 красавіка пяцідзённік мабілізацыі тары па раёнах і гарадох, штурм заліўкі гаручым і змазачным і праверку хаваньня гаручага па гаспадарках.

7. Прасіць ЦК ЛКСМБ выпучыць на час пасеўнай кампаніі адпаведную колькасьць камсамольцаў у дапамогу МТС і саўгасам для рэгуляваньня справы па завозе, хаваньні і выдаткаваньні гаручага і змазачных.

Наркамзем РАЧЫЦКІ,
Упаўнаважаны Наркамсаўгасаў ЖОЛУДАЎ.

РАБОТУ СПАЖЫЎКААПЭРАЦЫІ— НА СЛУЖБУ ВЕСНАВОЙ СЯЎБЕ

Шырокай хваляй пракаціўся па ўсім Саюзе балвы заклік першага Ўсесаюзнага зьезду калгасьнікаў-ударнікаў. Калгасы, калгасныя брыгады, калгасныя кі-ўдарнікі БССР, падхапіўшы адозву Ўсесаюзнага і Ўсебеларускага зьездаў калгасьнікаў-ударнікаў, адзін за адным уключаюцца ў шырока разгорнутае спа борніцтва на ўзорнае правядзеньне першай веснавой сяўбы другой бальшавіцкай пяцігодкі. Баявыя калёны ўдарнікаў ужо завяршаюць падрыхтоўку і ўступаюць у бой за лепшае правядзеньне сяўбы, за заваяваньне перадавых пазыцый павышэньня ўраджайнасьці сацыялістычных палёў, у бой за ажыцьцяўленьне гістарычных указаньняў тав. Сталіна аб рабоце на вёсцы.

Ці можа спажыўкаапэрацыя Беларусі, на якую партыяй і ўрадам ускладзены выключна адказныя задачы па абслугоўваньні веснавой сяўбы, ці можа яна стаяць у баку ад гераічнай барацьбы калгасьнікаў за паляпшэньне работы калгасаў, узьняцьце даходнасьці гаспадарак, павышэньне ўраджайнасьці, узмацненьне барацьбы з клясавым ворагам і г. д.? Бязумоўна, ня можа.

Але сыстэма спажыўкаапэрацыі БССР на сёньня яшчэ не адчувае поды ху вясны.

Да гэтага часу ва многіх мясцох у спажыўкаапэрацыі ёсьць недаацэнка тэй адказнасьці, якую яна нясе за лепшае правядзеньне пасеўнай кампаніі ва ўстаноўленыя партыяй і ўрадам тэрміны. Больш таго, рад кааперарганізацый асабліва на вёсцы ня здолелі наладзіць правільных узаемаадносін з калгасамі.

Мы маем у радзе месц факты ігнараваньня справы першапачатковай продажы вострадэфіцытных і наогул тавараў перадавым калгасьнікам, лепшым брыгадзірам, конюхам, трактарыстам, загадчыкам вучастку, аграномам, таксама працоўным еднаасобнікам, якія пепш падрыхтаваліся да сяўбы. Рад райсаюзаў мэтадам заклінаньняў, дэкларацый і цыркулярнічыны думае правесьці абслугоўваньне веснавой кампаніі (Полацак, Пятрыкоў, Крычаў, Клімавічы і інш.). Пытаньне заключэньня ўзаемных сацдагавораў з калгасамі ігнарусцца некаторымі райсаюзамі, як Крычаў, Хойнікі, Талачын. Такія райсаюзы, як Расонскі, Дрысенскі, Бешанковічы, Сіроцінскі, Чачэрскі і рад іншых, нават ня маюць плянаў абслугоўваньня веснавой пасеўнай кампаніі.

Яшчэ ў пачатку сакавіка сельспажыўтаварыства вёскі Мачыхі, Палтаўскага раёну (УССР), узяўшы на сябе цэлы рад абавязацельстваў па лепшым абслугоўваньні веснавой сяўбы, зьвярнулася да ўсіх сельспажыўтаварыстваў, да ўсяго каапэрацыйнага актыву з заклікам пасьледаваць іх прыкладу.

«Вясна,—гаворыцца ў адозьве,—не за гарамі. Трэба, каб хутчэй перабудаваліся сельспажыўтаварыствы. Мы заклікаем увесь каапэрацыйны актыў, усе сельспажыўтаварыствы Саюзу сакоу без адкладна, на-хаду перабудаваць сваю работу на аснове пастаноў партыі і апошняга пленуму Цэнтрасаюзу... Мы прапануем наладзіць спаборніцтва арганізацый спажыўкаапэрацыі на лепшы ўдзел у веснавой пасеўнай кампаніі. Да пачатку сяўбы засталося лічаныя дні. Безадкладна, сёньня-ж кожнае сельспажыўтаварыства, кожны работнік, актывісты сельскай спажывецкай каапэрацыі павінны ўзяцца за работу па-новаму, так, каб сэрца кожнага балела за агульную справу».

Гэтага закліку сыстэма спажыўкаапэрацыі Беларусі па сутнасьці яшчэ не падхапіла. Праўда, на прэзыдыуме Бел каапсаюзу і на ўсебеларускай нарадзе старшынь райсаюзаў адозва сельспажыўтаварыства вёскі Мачыхі абмяркоўвалася і прынята, але на мясцох яшчэ фактычна нічога ня зроблена для яе рэалізацыі.

Зараз газэтай «Зьвязда», Белкаапсаюзам і прафарганізацыямі АБВЯШЧАЕЦЦА ЎСЕБЕЛАРУСКІ КОНКУРС СЕЛЬСПАЖЫЎТАВАРЫСТВАЎ НА ЛЕПШАЕ АБСЛУГОЎВАНЬНЕ ВЕСНАВОЙ СЯЎБЫ, на лепшае выкананьне адозвы сельспажыўтаварыства в. Мачыхі. Бязумоўна, гэты конкурс павінен даць карэнны пералом у справе ліквідацыі ганебнага адставаньня сельскай каапэрацыі ў абслугоўваньні сяўбы.

Гэты конкурс, пад кіраўніцтвам партарганізацыі, павінен сапраўды падняць масы каапэрацыйнага і калгаснага актыву на лепшы ўдзел у сацыялістычнай перабудове вёскі. Посьпех гэтай справы вырашаюць жывыя людзі, выразнае ўмелая расстаноўка сіл, баявая праверка выкананьня, спаборніцтва паміж сельспажыўтаварыствамі, крамнікамі, каапупаўнаважанымі, асобнымі работнікамі і каапактывістамі.

Тысячы ўдарнікаў ёсьць у сыстэме спажыўкаапэрацыі, перадавых і самаадданых барацьбітоў за выкананьне дырэктыў партыі. ГЭТЫ КОНКУРС ПА ВІНЕН І МОЖА ЎДЗЕСЯЦЯРЫЦЬ ІХ РАДЫ.

Асноўная задача зараз—разгарнуць магутную хвалю сацспаборніцтва і ўдарніцтва на бальшавіцкае абслугоўваньне спажывецкай каапэрацыяй веснавой сяўбы. Падначаліць усю работу спажыў. каапэрацыі, асабліва на вёсцы, задачам дасягненьня самых высокіх ураджаяў, задачам ажыцьцяўленьня лёзунгу правадыра нашай партыі тав. Сталіна аб тым, каб зрабіць усіх калгасьнікаў заможнымі.

Работа кожнага ў пасобку сельспажыўтаварыства ў правядзеньні пасеўнай кампаніі будзе ацэньвацца па наступных асноўных паказальніках:

— лепшая арганізацыя продажу вострадэфіцытных і наогул тавараў лепшым саўгасным, калгасным брыгадам, калгасьнікам-ударнікам і лепшым бедным і сярэдняком—еднаасобнікам, якія цалкам выконваюць пляны сяўбы як па якасьці, так і па колькасьці ва ўстаноўленыя тэрміны;

— заключэньне і лепшае выкананьне сацдагавораў паміж сельспажыўтаварыствамі і калгасамі, калгаснымі брыгадамі і групамі працоўных еднаасобнікаў на ўдарнае ажыцьцяўленьне вытворчых пляноў і заданьняў і на лепшае стыму пяваньне ўдарнікаў адпаведнымі прэмтаварамі. Сацдагавор павінен зьявіцца канкрэтным дакумантам, які падлягае абавязковаму двухбаковаму выкананьню.

«У вельмі многіх сельспажыўтаварыствах асартымэнт тавараў вельмі бед

І. ЛЫЧОЎ

СУМЕСНУЮ РАБОТУ КК-РСІ З ДРУКАМ—НА ВЫШЭЙШУЮ СТУПЕНЬ

Гістарычны [illegible]ньскі пленум ЦК і ЦКК УсеКП(б) [illegible]зёў вынікі бальшавіцкіх перамог у справе выканання пяцігадовага плану народнай гаспадаркі, перамог рабочай класы нашай краіны на ўсіх участках сацыялістычнага будаўніцтва. Пленум выпрацаваў праграму дзеяньня другой пяцігодкі — пяцігодкі пабудовы бясклясавага сацыялістычнага грамадзтва.

Перад кантрольнымі камісіямі і іх найпыр[illegible]ум актывам — рабочымі і калгасьні[illegible]мі, перад усім бальшавіцкім друкам і яго арміяй рабселькораў, якія пад кіраўніцтвам нашай партыі прымалі актыўны ўдзел у выкананьні гістарычных задач першай пяцігодкі, — партыяй пастаўлены непасрэдныя адказныя задачы ў другой пяцігодцы па далейшым, яшчэ большым умацаваньні дыктатуры пралетарыяту, мабілізаваньі ўсіх сіл рабочай класы і працоўнага сялянства на ажыцьцяўленьне гістарычных задач, пастаўленых пленумам ЦК і ЦКК. Гэтыя вялікачэнныя задачы мы здолеем выканаць поўнасьцю толькі пры ўмове непрымірымай барацьбы за генеральную лінію партыі і яе неадлучную частку — ленінскую нацыянальную палітыку, супроць правага ўхілу, як галоўнай небясьпекі на даным этапе, супроць апартуністаў усіх масьцей, агентаў кулака, перарадзкавацаў, жулікаў з партбілетамі ў кішэні, супроць усіх тых, хто прабуе і папрабуе перашкодзіць будаўніцтва сацыялізму.

Тав. Кагановіч на пленуме ЦК і ЦКК УсеКП(б) гаварыў: «Мы не павінны з вамі аслабляць магутнасьці пралетарскай дыктатуры, магутнасьці пралетарскай улады і яе ўдару па ворагу, бо задача зьнішчэньня клясаў, якую мы перад сабой паставілі, німіпуча выклікае абастрэньне клясавай барацьбы, у якой супраціўленьне ворага будзе зломлена тым хутчэй, чым з большаю сілай вывіцца магутнасьць пралетарскай дыктатуры».

Гігантыя задачы, пастаўленыя пленумам ЦК і ЦКК УсеКП(б), абавязваюць кантрольныя органы і бальшавіцкі друк, асабліва БССР, якая знаходзіцца на рубяжы з капіталістычным сьветам, умацніць і разгортваць сумесную работу па барацьбе з кляславым ворагам, мабілізаваўшы на гэту справу ўвесь актыў РСІ і рабселькораўскую армію для таго, каб практычна, з усёй энэргіяй біцца за рэалізацыю гістарычных задач, пастаўленых перад намі партыяй.

***

ЦКК УсеКП(б) у сваёй пастанове (кастрычнік 1931 г.) аб сумеснай рабоце кантрольных камісій з друкам запісала наступнае:

«Узмацніць яшчэ ў большай меры папулярызацыю ў друку работы органаў КК-РСІ і арганізацыю мясавага кантролю шляхам сыстэматычнай сувязі з рэдакцыямі газэт і рабселькораўскімі арганізацыямі, практыкуючы прыцягненьне да гэтай працы работнікаў актыву РСІ, рабкораў і членаў партыі»,

таму, што:

«Сумесная работа ўдарнікаў друку і актыву КК-РСІ на прадпрыемствах і ў калгасах спрыяе ўцягненьню новых кадраў рабочых — ударнікаў і перадавых калгаснікаў — у барацьбу з бюракратызмам, актыўнай рабоце па палепшэньні рабочага апарату, павышае ролю як друку, так і РСІ ў справе ўпячэньня мас у кіраўніцтва дзяржавай».

Органы КК-РСІ БССР у 1931-32 годзе разам з друкам прарабілі вялікарную работу па праверцы гатоўнасьці да сяўбы. Агляд дапамог мабілізаваць пралетарскую грамадзкасьць Беларусі на ліквідацыю прарываў, на выпраўленьне памылак да новага будаўніцтва. Былі праведзены сумесныя рэйды актыву КК-РСІ і ўдарнікаў друку па лесазагатоўках, уборачнай кампаніі. Разам з рэдакцыямі цэнтральных і раённых газэт быў праведзен масавы рэйд па праверцы рэагаваньня на газэтныя заметкі і на крытыку ў друку. Праверка выявіла шматлікія выпадкі заціску самакрытыкі, ганеньня на рабселькораў, бюракратычных адносін да заяў і скаргаў працоўных. Вынікі праверкі абмяркоўваліся на зьлётах рабселькораў і актыву РСІ. Была вынесена спэцыяльная пастанова прэзыдыуму ЦКК КП(б)Б па гэтым пытаньні. Але ўсё гэта, бясспрэчна, зьяўляецца далёка невыстарчальным.

Чула рэагаваць на заметкі ў друку і скаргі працоўных

Адным з важнейшых пытаньняў, якому партыя і ўрад надаюць вялікае значэньне, зьяўляецца неадкладнае і чулае рэагаваньне на заметкі ў друку і скаргі працоўных.

Праваднік і настаўнік сусьветнага пралетарыяту тав. Ленін вучыў нас і паказваў прыклады, як трэба рэагаваць па рабселькораўскія заметкі і скаргі працоўных. Вось ліст Уладзімера Ільліча Леніна А. С. Кісялёву аб заметцы Міхельса пра грузы, якія залежыліся, ад 15-IX—1921 году:

«Зварачаю вашу ўвагу на заметку Міхельса ў № 3 «Известий» ад 13-IX. Аўтар піша, што з 1918 г. ляжаць 2,5 млн. пудоў канцтоўнейшых мэталёвых грузаў на складах, амаль у балоце, на ўлічэньні, не ахоўваюцца, расьцягваюцца, гінуць.

Прашу вас тэрміново праверыць правільнасьць заметкі. У выпадку яе правільнасьці — прымеце неадкладна ўсе неабходныя меры да ўліку, аховы маемасьці, прыцягненьня да самай строгай адказнасьці вінаватых. Прадстаўце мне падрабязны пісьмовы дакладз з указаньнем імён і пасад вінаватых у гэтым злачынстве асоб і павядамьце у СНА.

Прашу вас прывесьці ўсё гэта ў самы кароткі тэрмін.

Старшыня СНК Ленін».

Уладзімер Ільліч дае прыклад надзвычай чулых і ўважлівых адносін да лістоў і скаргаў рабочых. З далёкага Якуцкага вычгнаньня, з пятраў буржуазнай эміграцыі, Ленін вёў рэгулярную перапіску са шматлікімі групамі рабочых, з асобнымі рабочымі і работніцамі. Стоячы ля руля кіраўніцтва пралетарскай дзяржавай, Уладзімер Ільліч з уласьцівай яму бязьлітаснасьцю праміў бюракратаў, якія праявілі бяздушныя адносіны да лістоў і скаргаў рабочых, патрабуючы прыцягненьня вінаватых да найстражэйшай адказнасьці.

А як-жа стаіць справа з рэагаваньнем у нас? Ня гледзячы на рад пастаноў партыі і ўраду аб самых чулых і ўважлівых адносінах да скаргаў калгаснікаў, рабочых аб неадкладным рэагаваньні на кожную заметку, у нас у цэлым радзе арганізацый і ўстаноў бясьцэ ясная недаацэнка гэтай важнейшай палітычнай справы. Лісты і скаргі працоўных народка валяюцца ў сталах установаў і кішэнях бюракратаў цэлымі месяцамі, што зьяўляецца грубейшым запіскам самакрытыкі. Пяройдзем да фактаў.

Скарга рабочага Ліпаўкі аб няправільным звальненьні яго з работы праляжала ў работніка віцебскага райпрафсаўчу Горшкіна 4 месяцы. Тав. Ліпаўка па-пралетарску, адкрыта крытыкаваў бюракратаў райпрафсаўу, патрабуючы аднаўленьня яго на рабоце, але нічога не дапамагло. Бяздушныя бюракраты, махровыя апартуністы райпрафсаўу заставаліся глухімі. Толькі ўмяшаньне РКК-РСІ спыніла выдзеканьне над тав. Ліпаўкай і па заслугах пакарала вінаватых.

У дрысенскай райвіліцыі няма нічога ўліку паступленьня заметак. Работнік райвіліцыі Шымінскі адказаў брыгадзе КК-РСІ паступнае: «Я быў у водпуску і ня ведаю, што робіцца. Мане абвешчаваць няма чаго».

Дрысенская райгазэта сыгналізавала аб хуліганстве на дарожным участку. Справа была перададзена міліцыі. Міліцыя перадала парсуну, парсуну — пракуратуры, і зноў спачатку. У результаце хуліганы на працяку 5 месяцаў ня былі пакараны.

Ход мясавага рэйду праверкі, які праводзіць ЦКК сумесна з культпроп ам ЦК і рэдакцыяй газэты «Зьвязда», аб праходжаньні і выкарыстаньні лістоў рабочых, калгаснікаў у рэдакцыях цэнтральных і раённых газэт і праверкі рэагаваньня ў некаторых цэнтральных і раённых установах, — ускрыў цэлы рад анфіпасьцій, па сутнасьці антыпартыйных, бяздушных адносін да лістоў і скаргаў рабочых і калгаснікаў.

У рэдакцыях «Сельгасрабочы», «Юнгер Арбэйтэр» адсутнічае ўсякі ўлік паступленьня рабочых лістоў і рэагаваньне на іх. Дзесяткі лістоў ляжаць у сталах цэлымі месяцамі бяз усякага руху. Ці можна такую газэту назваць бальшавіцкай, калі яна замест барацьбы за дзейснасьць друку сама стала на шлях яўнага бюрэйску прытыкі і самакрытыкі? Па заметках адной толькі «Зьвязды», паданых на расьсьледваньне яшчэ ў 1932 годзе, няма ніякага рэагаваньня: з боку Наркамсобесу на 23 заметкі, Наркамахопы здароўя — на 10, Галоўдарпрансу — 10, Белдарбуду — 10, галоўміліцыі — 6 і г. д., што зьяўляецца яўным парушэньнем дырэктыў партыі і ўраду па гэтым пытаньні.

Пракуратура рэспублікі, якая абавязана прыцягваць да найстражэйшай адказнасьці асоб і ўстановы, якія не рэагуюць на скаргі і лісты працоўных, сама не рэагавала на пасланыя ёй адной толькі «Зьвяздой» у 1932 годзе 29 заметак, што выкрывалі рад абураючых злачынстваў.

Нярэдкі выпадкі, калі нашы прафарганізацыі ня толькі нічула адносяцца да штодзённых «дробязяй быту» працоўных, але проста не рэагуюць на скаргі і заметкі ў друку.

ЦСПСБ, які павінен весьці непрымірымую барацьбу з чыноўніцкімі, бяздушнымі адносінамі да патрэб рабочых, сам не рэагуе на 9 заметак, пасланых «Зьвяздой» у 1932 годзе, забываючы, што:

«Работа тэй ці іншай прафарганізацыі павінна адзначацца ў першую чаргу тым, наколькі саюз зьвязан з масай, ведае настроі рабочых, умее арганізоўваць рабочых і весьці іх па правільным шляху, колькі пастуцае скаргаў, заяў, эвакуацый рабочых, як яны вырашаны прафарганізацыяй» (Кагановіч, IX зьезд прафсаюзаў).

Некаторыя РКК і рэдакцыі райгазэт ня толькі ня здолелі ўзначаліць барацьбы за дзейснасьць друку, але самі, не рэагуючы на заметкі і скаргі працоўных, спрыялі заціску крытыкі і самакрытыкі. Гэта ў першую чаргу адносіцца да Пухавіцкага, Круп скага, Талачынскага, Горацкага раёнаў. Кантрольныя камісіі гэтых раёнаў не вядуць штодзённай барацьбы за дзейснасьць друку, за чулыя адносіны да кожнага ліста рабочага, калгасніка, працоўнага сялянина — адназасобніка, не праваракуецца выкананьне пастановы ЦКК па гэтым пытаньні. Не даюцца рашучага адпору асобным бюракратам і чыноўнікам, якія зарваліся, якія лічаць справу рэагаваньня на скаргі працоўных ніжэй сваёй годнасьці.

Ня лепш справа стаіць і ў рэдакцыях вышэйпамянёных раёнаў. Там няма ніякага ўліку паступленьня лістоў рабочых і калгаснікаў, не вядзецца пасьлядоўнай барацьбы за рэалізацыю і правільнае вырашэньне кожнага зьмешчанага ліста. Больш таго, самі рэдакцыі марынуюць у сябе цэлымі месяцамі скаргі і лісты працоўных.

У спэцыяльна вынесенай па гэтым пытаньні ў верасьні 1932 г. пастанове прэзыдыум ЦКК КП(б)Б запісаў наступнае:

«Прэзыдыум ЦКК катэгарычна патрэбуе кіраўнікоў усіх парткамітэтаў, абгарадзкіх, раённых устаноў, прадпрыемстваў, калгасаў і саўгасаў, што калейшыя спробы абыйсьці маўчаньне, або падыйсьці фармальна да справы рэагаваньня на сугнасьці і срэлавіта на крытыку ў друку, ЦКК будзе фастлядаць, як трубейшае парушэньне дырэктыў партыі аб рашучым разгортваньні бальшавіцкай самакрытыкі, і канкрэтныя вінаватыя ў гэтым будуць прыцягнуты да партыйнай адказнасьці, аж да выключэньня з партыі і зьняцьця з работы».

І, бязумоўна, ЦКК будзе яшчэ в большай сілай праводзіць сваю пастанову ў жыцьцё з усёй уласьцівай бальшавіком настойлівасьцю. Разам з бальшавіцкім друкам, шляхам правядзеньня сумесных рэйдаў, зьлётаў, нарад, уцягваючы ў гэту важнейшую справу найшырэйшыя масы рабселькораў і актыў, РКК-РСІ паносіць сакрушальны ўдар па бюракратызьме, цеганіне, нячулых адносінах да штодзённых патрабаваньняў працоўных.

Узмацніць барацьбу з зажымшчыкамі самакрытыкі

Тысячы ленінскіх рабселькораў «узмацніраў грамадзкай пралетарскай думкі», ня гледзячы на жорсткае супраціўленьне клясавага ворага, здолелі і дапамаглі партыі в усёй уласьцівай работнікам бальшавіцкага друку настойлівасьцю ўскрыць контрэвалюцыйныя гнёзды кулакоў, сабатажнікаў, лоцьманаў, прагульшчыкаў, апартуністаў усіх масьцей. Актыўны рабкор, член партыі з 1921 году, тав. Рапчэнка ня гледзячы на цкаваньне, ганеньне, пагрозы адшомсьціць, дапамог партыі ўскрыць яўна контр-рэвалюцыйную дзяржаўную ў адным конкрэтным сагасе, дзе кіраўніцтва з былых людзей на працяку доўгага часу займалася самаснабжэньнем, расьцягваньнем дзяржаўнай маемасьці і пад відам «прафілактычных мер» атручвала маладняк. Гэтыя заядлыя ворагі рабочай клясы стаяць хутка перад пралетарскім судом і бясспрэчна, атрымаюць па заслугах.

Селькор Бумажкоў у Горацкім раёне ўскрыў кулацкія махінацыі ў калгасе, дзе кулакі, карыстаючыся прыступленьнем клясавай шільнасьці сельскіх арганізацый, пралезлі ў калгас, раскрадвалі калгасную маемасьць, зьдзекваліся з бедняцкіх-калгасьнікаў, ператвараючы іх у сваіх парабкаў, дзе за ўсякія спробы выступленьня супроць гэтай кулацкай шрай сельскіх сыстэматычна зьбіваліся.

Бліскучыя ўзоры рабкораўскай дзейнасьці тав. Шумскага (Гарадок), Аляксейчыка (Бялынічы), Плотніна (Гомель), Каплана (Рэчыца) і шмат сотень іншых ленінскіх рабселькораў, якія вялі на старонках друку суровую і рашучую барацьбу за генэральную лінію партыі, шлюй раз пацьвярджаюць сказанае правадыром нашай партыі тав. Сталіным, што «бяз крытыкі і самакрытыкі, мы рупіцца ўперад не маглі», пацьвярджаюць неабходнасьць узмацненьня барацьбы з зажымшчыкамі самакрытыкі. Вось, што сказаў тав. Сталін на сходзе актыву Маскоўскай партарганізацыі ў 1928 годзе:

«Я думаю, таварышы, што самакрытыка нам патрэбна, як паветра, як вада. Я думаю, што без яе, без самакрытыкі, наша партыя не магла-б рупіцца ўперад. Яна не магла-б ускрываць нашых язваў. Яна не магла-б ліквідаваць нашых недахопаў. А недахопаў у нас многа. Гэта трэба прызнаць адкрыта і сумленна. Я ведаю, што ў радах нашай партыі ёсьць людзі, якія недалюбліваюць крытыкі наогул, са самакрытыкі ў асаблівасьці. Гэтыя людзі, якіх-бы я мог назваць «ляківаванымі жамчуг[illegible]стамі», тое і робяць, што бубняць, адмахваючыся ад самакрытыкі: моў, зноў гэта праклятая самакрытыка, зноў вывачэньне нашых недахопаў, ці нельга нам даць ласкаваць спакойна. Яснa, што гэтыя «ляківаваныя жамчужыны» ня маюць нічога агульнага з духам нашай партыі, з духам бальшавізму».

І, бязумоўна, недаацэнка, а часам простае ігнараваньне волі бальшавіцкай крытыкі і самакрытыкі даюць зброю клясаваму ворагу ў барацьбе супроць нашых ленінскіх «каманцыраў грамадзкай пралетарскай думкі» — рабселькораў.

У студзені гэтага году ў вёсцы Кабылічы, Пухавіцкага раёну, кулак заразаў актывіста-селькора тав. Агейчыка Івана, які вёў актыўную барацьбу з кулакамі-сабатажнікамі загатовак і іх агентурай, вёў рашучую барацьбу за арганізацыйна - гаспадарчае ўмацаваньне калгасаў. Ці ўзьнімуць раённыя арганізацыі, і ў першую чаргу РКК і газэта, гэту вылазку заклятага ворага рабочай клясы на прынцыповую палітычную выпыту з мэтай яшчэ большай мабілізацыі рабочых, калгасных мас раёну на ўзмацненьне барацьбы з рэшткамі капіталістычных элемэнтаў? Не. Раённая кантрольная камісія проста прыняла гэта да ведама, а рэдакцыя райгазэты абмежавалася асьвятленьнем гэтага тэрарыстычнага акту кулака супроць актывістаў і змагароў за нашаа сацыялістычнае будаўніцтва ў выглядзе абвесткі.

Пад носам райпартарганізацыі Бялынічскага раёну кулакі доўгі час зьдзекваліся з калгасніка, актывіста-селькора тав. Аляксейчыка. Забраўшыся ў праўленьне калгасу з мэтай разбурыць яго з сярэдзіны, кулакі проста кацелі пазбавіцца ад тав. Аляксейчыка, які патрабаваў на старонках раённай газэты неадкладнага выключэньня іх з калгасу. Кулакі-праўленцы выключылі тав. Аляксейчыка з калгасу, зьбівалі яго і жонку на вуліцы, дома і пазвалі у сельсавеце. Усе просьбы Аляксейчыка адпавіць яго назад у калгас з прыцягненьнем вінаватых у зьбіваньні і цкаваньні да адказнасьці, ні да чаго не прывялі. Тав. Аляксейчык быў вымушан пракаць усё, што меў, і перасхаць у Менск. Толькі непасрэднае ўмяшаньне ЦКК і газэты «Зьвязда» спыніла зьдзекваньне над актыўным селькорам і ачысьціла калгас ад клясавых ворагаў.

На ст. Быхаў клясавы вораг, выкарыстоўваючы прыступленьне клясавай шільнасьці парт. і прафарганізацый станцыі, перайшоў у адкрыта атаку, забіраючы ад старога рабочага-ўдарніка ўдарную кніжку за зусім правільнае выступленьне яго на агульным сходзе. Варта падаць яго ліст, надрукаваны ў рэдакцыі райгазэты:

«Я грузчык. Ужо 12 год працую на гэтай пасадзе на ст. Быхаў. За ўвесь час маёй работы ніякіх спагнаньняў, заўваг па рабоце ня меў. Як ударнік, атрымаў прэмію. Ужо другі год за ўдарную работу я карыстаюся ўдарнай кніжкай. Цяпер не хочуць адабраць. За што? У партыколе мане вучаць, што мы павінны быць клясава шільнымі, разгортваць крытыку і самакрытыку, выяўляць клясавага ворага. На адным са сходаў я выступіў і ўказаў, што направільна раздалі прэміі, што лепшыя прэміі адхілі маскоўным і спэкулянтам, а таксама і тым, якія працуюць на вытворчасьці. За гэта выступленьне мане назвалі бузацёрам і пастанавілі адабраць ударную кніжку. Ня ведаю — можа быць я ня маю рацыі, можа быць я памыліўся ў сваім выступленьні, але дзе гэта відаць, каб за выступленьне на сходзе пазбавілі назвы ўдарніка і адабралі ўдарную кніжку? Н. Гуціч».

Як-жа на гэты яўны заціск самакрытыкі рэагавала сама рэдакцыя? Вось, што рэдакцыя ад сябе напісала пад лістом тав. Гуціча:

«Адбіраць ударную кніжку і гэтым самым пазбавіць назвы ўдарніка за выступленьне на сходзе, нават памылковае — зьяўляецца яўным заціскам самакрытыкі. Рэдакцыя патрабуе ад мясцкому чыгункі неадкладнага адпаўленьня таварыша Гуціча ў правах ударніка». Вось і ўсё.

Рэдакцыя ня ўзьнімаючы пытаньня на прынцыповую палітычную выпыту, не даючы рашучага адпору зажымшчыкам самакрытыкі, прагаўлюючы лібералізм у такім абураючым факце, гэтым самым стала на шлях грубейшага заціску самакрытыкі. Яна не мабілізавала працоўных Быхаўшчыны на разгортваньне крытыкі і самакрытыкі, не даючы тым самым рашучага адпору. Усім тым, хто парушае пастановы партыі і ўраду па гэтым важнейшым пытаньні.

Ці ўмешалася ў гэту справу раённая кантрольная камісія? На гэта пытаньне трэба адказаць словамі самога старшыні Быхаўскай РКК тав. Хамкова: «Прызнацца, не заўважыў я гэтага ў райгазэце. Прыеду — праверу».

Прыведзеныя факты наглядна паказваюць, што мы яшчэ далёка невыстарчальна вядзем барацьбу супроць зажымшчыкаў самакрытыкі, што нашы некаторыя кантрольныя камісіі, а дзе-ні-дзе і друк, не зрабілі ўсяго магчымага для мабілізацыі актыву РСІ і ўсёй арміі рабселькораў на разгортваньне бальшавіцкай крытыкі і самакрытыкі. Гэтыя факты гаворяць аб тым, што ня ўсюды і не заўсёды самакрытыка знаходзіцца на належнай вышыні, што ня ўсюды яшчэ вядзецца сыстэматычная і ўпартая барацьба з недаацэнкай друку, прасьледваньнем рабселькораў.

Настойліва змагацца за дзейснасьць рабселькораўскага матар'ялу і рашуча ліквідаваць усе спробы заціску самакрытыкі, ад каго-бы яны ня выходзілі, — вось задача кожнага актывіста РСІ, кожнага рабселькора, кожнага работніка бальшавіцкага друку.

Усе гэтыя факты патрэбуюць яшчэ большую неабходнасьць разгортваньня сумеснай работы РСІ з друкам, уцягваючы ў гэту важнейшую справу армію рабселькораў і асабліва сельскі актыў РСІ.

Аб рабоце ў галіне прамысловасьці

Вялізарныя задачы першага году другой пяцігодкі, пастаўленыя перад партыяй і рабочай клясай у пастановах абгарадзкага студзеньскага пленуму ЦК і ЦКК УсеКП(б), робяць асабліва адпаведнай ролю КК-РСІ і бальшавіцкага друку. Апошнія павінны перабудаваць усю сваю работу такім чынам, каб забясьпечыць сыстэматычны кантроль за выкананьнем асноўнай устаноўкі партыі, данай у дакладзе тав. Сталіна.

На аснове пастаноў апошняга пленуму ЦК і ЦКК УсеКП(б), якія адкрываюць новую паласу сацыялістычнага будаўніцтва ў ССР і яе сустаўной частцы — БССР, нашы КК-РСІ і друк павінны перабудаваць усю сваю штодзённую работу. Важнейшыя пытаньні, высунутыя партыяй, павінны стаць асяжком у рабоце кантрольных камісій і ўсяго бальшавіцкага друку.

Асваеньне новых прадпрыемстваў і працэсаў вытворчасьці, асваеньне новай тэхнікі, новых варштатаў патрабуе ўпартай работы і правільнай расстаноўкі сіл.

Вялікая роля ў гэтай важнейшай справе належыць ЦКК-РСІ і друку, якія павінны разгарнуць сіламі свайго актыву на прадпрыемствах, фабрыках, заводах, цэхах, сіламі актыву РСІ, селькораўскай арміі і ўсёй нашай пралетарскай грамадзкасьці барацьбу за новую дысцыпліну працы, барацьбу з рэшткамі дробна-буржуазнай псыхалёгіі, буржуазных звычак у адносінах да працы, арганізаваць сацыялістычны гаспадаркі, арганізуючы кантроль над работай асобных цэхаў і асобных варштатаў, асабліва там, дзе машыны і тэхнічныя працэсы яшчэ не даволі асвоены.

Перанясьненьне лепшага вопыту з перадавых на адстаючыя прадпрыемствы і варштаты становіцца выключна важнай справай КК-РСІ, цэнтральнага, раённага і заводзкага друку.

Цэнтральны друк павінен у гэтай справе аказаць вялікую дапамогу нашым заводзкім пматтыражкам, цэхавым насьценным газэтам, шляхам правядзеньня сумесных зьлётаў работнікаў заводзкіх газэт, супольна з актывам РСІ і рабкорамі на прадпрыемствах, асьвятляючы сумесную работу на старонках заводзкага друку з мэтай свайчасовай сыгналізацыі і ліквідацыі ўсіх перашкодаў, якія ёсьць і будуць мець месца на шляху вырашэньня адказных задач, пастаўленых перад намі партыяй.

Сумесная работа актыву РСІ з нізавым друкам на прадпрыемствах дасьць добрыя результаты толькі ў тым выпадку, калі кожны актывіст РСІ, кожны рабкор, праверыўшы тую ці іншую работу прадпрыемства, будзе на-бальшавіцку біцца за рэалізацыю кожнага пункту прапановы, высунутай кантрольна - праверачнай брыгадай.

Шляхам сыстэматычных агляданьняў і непасрэднай дапамогі нізавому друку, цэнтральны друк павінен дапамагчы яму ў яшчэ большым уцягненьні і мабілізацыі ўсёй пралетарскай грамадзкасьці на справу разгортваньня сумеснай работы КК-РСІ з друкам, свайчасова выпраўляючы недахопы ў яго рабоце. Цэнтральны друк, у прыклад усяму раённаму і нізавому друку, павінен будзе яшчэ пісьней зьвязацца з ЦКК-РСІ, праводзячы сумесныя масавыя мерапрыемствы, і на сваіх баявых старонках асабліва ў «лістках ЦКК РСІ», узмацніць барацьбу з клясавым ворагам і яго агентурай, якія ў перадсьмяротнай агоніі прабуюць яшчэ перашкодзіць нашаму сацыялістычнаму будаўніцтву.

Аб рабоце ў галіне сельскай гаспадаркі

Недахопы работы нашых арганізацый, укрытыя тав. Сталіным у яго праграмнай гістарычнай прамове «Аб рабоце ў вёсцы» на студзеньскім пленуме ЦК і ЦКК УсеКП(б), поўнасьцю адносяцца да нашых арганізацый у Беларусі, да нашых кантрольных органаў у ёй. Сёлетняя абоскказагатоўчая кампанія гэта поўнасьцю паць вярджае.

Некаторыя КК і частка нашых газэт ня толькі ў сваёй практычнай рабоце не арганізавалі барацьбы з тым «селькоры»?

ЗАЎВАГА: Кантрольныя камісіі і рэдакцыі гэтых раёнаў прыцягнуты ЦКК да адказнасьці.

кулаком і яго агентурай, але, страціўшы клясавую пільнасьць, аказаліся ў палоне клясавага ворага.

Сіроцінская кантрольная камісія выступіла ў абарону трох «актыўных селькораў» Лукіна, Зубарава і Каслоўскага, якія ўсю сваю «селькоравую дзейнасьць» накіравалі на абарону кулакоў, злодзеяў, жулікаў, самі прымаючы актыўны ўдзел у разбазаваньні калгаснай маемасьці і разбурэньні калгасаў. Хто-ж яны, гэтыя «селькоры»?

Лукін — сын кулака, брат яго асуджан на 10 год за бандытызм, сам Лукін прыцягваўся да адказнасьці за хаваньне і выраб зброі.

Зубараў — сын кулака, раскрадальник грамадзкай маемасьці.

Каслоўскі (настаўнік) — натхніцель і кіраўнік шкодніцкай групы. Сам браў хабары ад кулакоў, якіх ён абараняў, дасьцігаў калгасную маемасьць.

Гэта тройка на працягу доўгага часу раскрадвала калгасную маемасьць, разбуравала калгасы шляхам уцягваньня туды кулакоў, выганяючы адтуль актыўных калгаснікаў—беднякоў.

Калі да гэтага дадаць, што Лукін быў старшынёй сакцыі РСІ ў Старынаўскім сельсавеце, дык стане зусім ясна, што Сіроцінская РКК-РСІ капчаткова страціла клясавую пільнасьць.

І пакат тады, калі пасьля настойлівага патрабаваньня пракурора тав. Пашкова гэта шайка была арыштавана, РКК вынесла спэцыяльную пастанову ў абарону «шчырных селькораў», а райгазэта выступіла з цэлай старонкай, патрабуючы прыцягненьня вінаватых у цкаваньні і ганеньні «актыўных селькораў-грамадзкіх працаўнікоў» да суровай адказнасьці, і, бязумоўна, РКК і газэта зьяўляюцца непасрэднымі вінаватымі ў разбурэньні калгасаў, у нікудышнай падрыхтоўцы да сяўбы, у тым, што Сіроцінскі раён знаходзіўся доўгі час на чорнай дошцы.

Цэнтральная газэта «Сельгасрабочы», ня толькі не змагалася за загатоўкі, але капчаткова страціла клясавую пільнасьць. Сам былы рэдактар газэты Хацяновіч разам з усім апаратам рэдакцыі накладваў вечарынкі-папойкі з яўна контр-рэвалюцыйным зьместам, у прысутнасьці і па ініцыятыве работніка газэты, былога лідэра меншавікоў — Гольдзіна. Апарат гэтай, з дазволу сказаць, рэдакцыі складаўся, галоўным чынам, з чужых нам людзей, якія нічога агульнага ня маюць з лініяй партыі. Ці магла такая газэта па-бальшавіцку змагацца на абоскказагатоўчым і пасеўным фронце? Бязумоўна, не.

З аглядаў друку «Зьвязды» і інш. цэнтральных газэт мы ведаем, што некаторыя раённыя газэты аказаліся проста нікудышнымі ўпачаўшы барацьбу з кулацкім сабатажам загатовак. Асабліва дрэнна стаіць справа з нізавым друкам у вёсцы. Там мы проста маем факты, калі насьцепная газэта калгасу ці саўгасу, на чале якой стаялі, а дзе-ні-дзе і стаяць кулацкія агенты, выступае ў абарону кулака.

Такі факт мы мелі ў Бялыніцкім раёне, калі калгасная газэта, на чале якой знаходзіўся сын кулака, выступіла ў абарону кулакоў, зьбіваўшых актыўнага селькора Аляксейчыка; у Крупскім раёне, дзе частка калгасных газэт зраслася з кулаком і яго агентурай; у Сіроцінскім раёне, дзе рэдактарамі насьцепнагазэт у Пагарэльчыцкім сельсавеце былі кулакі.

Гэта лішні раз гаворыць аб тым, што жалезная мятла рабочай класы павінна ачысьціць наш бальшавіцкі друк ад кулацкіх агентаў. Больш увагі падбору газэтных работнікаў, адважней выхоўваючы і вылучаючы на гэты адказны вучастак лепшых рабселькораў, якія на справе даказалі сваю адданасьць партыі.

Частка нашых кантрольных камісій не зразумела цяперашняй палітыкі на вёсцы. Тав. Сталін у сваім растлумачэньні ў артыкуле «Да пытаньняў палітыкі ліквідацыі кулацтва як класы», сказаў наступнае:

«Цяперашняя палітыка партыі ў вёсцы ня ёсьць працяг старой палітыкі, а паварот ад старой палітыкі абмежаваньняў (і выцясьненьняў) капіталістычных элемэнтаў у вёсцы да новай палітыкі ліквідацыі кулацтва як класы.

«Нэпман» — новая буржуазія— ня ў сілах ужо павесьці за сабой сялянскую масу. Памірэючае кулацтва, этольнае яшчэ прынесьці вялізарную шкоду рабочым і сялянам, займецца шкодніцтвам у сельскай гаспадарцы, зрываць нашы мерапрыемствы ў асобных мясцох, у асобных раёнах. Барацьба ў гэтых умовах ня можа спыніцца ні на адну мінуту».

Мы ў часе загатовак зьнялі кіраўніцтва некаторых кантрольных камісій (Старобін, Прапойск, Нароўля, Чырвонапольле), якія ня здолелі забясьпечыць выкананьня пастановы нашай партыі і якія сваёй бяздзейнасьцю і прытупленьнем клясавай пільнасьці дапусьцілі рад грубейшых палітычных памылак, ня здолелі мабілізаваць увесь актыў КК-РСІ на барацьбу за свайчасовае выкананьне загатовак.

Трэба проста сказаць, што ва многіх калгасах і саўгасах, у сельсаветах групы садзейнасьці РСІ не адчуваюцца. РКК-РСІ яшчэ вельмі мала зрабіла ў справе выхаваньня гэтага актыву, каб выкаваць з яго актыў нага змагара за правядзеньне палітыкі партыі на вёсцы.

Калі ў нас у цэнтры (у Менску) быў праведзен цэлы рад мерапрыемстваў ЦКК-НК РСІ з друкам, дык у раёнах гэта работа пастаўлена зусім слаба. Мы вельмі мала маем правядзеньня сумесных рэйдаў, зьлётаў, актыў КК-РСІ зусім слабы, а ў некаторых раёнах зусім ня ўцягнут у наладжваньне сумеснай работы з друкам.

Кантрольныя камісіі, увесь наш друк і іх найпырэйшы актыў у вёсцы павінны ўзмацніць увагу да сельскай гаспадаркі, праводзячы ў жыцьцё сумесныя мерапрыемствы, якія арганізацыйна і гаспадарча ўмацоўваюць калгасы і саўгасы, паўмацоўваюць уладкайнасьць нашых палёў, бо:

«Галоўны фэр павінен быць зроблен не на колькасны рост працэнты, а на паляпшэньне якасьці прадукцыі і рост прадукцыйнасьці працы прамысловасьці, не на папыраньне пасеўных плошчаў, а на рост уладкайнасьці ў земляробстве і паляпшэньне якасьці работы ў нашай гаспадарцы».

Пастанова пленуму аб арганізацыі палітадзелаў МТС і саўгасаў—гэта новае, што ўносіцца ў практыку ўсёй нашай работы. Палітадзелы павінны будуць аказваць вялікую дапамогу нашым кантрольным камісіям у справе ўцягваньня і выхоўваньня новага актыву з лепшых ударнікаў, калгаснікаў і працоўных адпаведнікаў, выкоўваючы з іх актыўных змагароў за падрыхтоўку і правядзеньне бальшавіцкай сяўбы, арганізацыйнае ўмацаваньне калгасаў і павышэньне ўладкайнасьці нашых палёў.

Уся гэта сумесная работа КК з друкам павінна знайсьці шырокі адбітак на старонках раённага нізавога друку, уцягваючы ў гэту важную справу шырокі актыў калгаснікаў-ударнікаў і рабочых саўгасаў. Калгаснікі-ўдарнікі ў першую чаргу павінны стаць актывістамі РСІ. КК-РСІ і друку на мясцох неабходна правесьці аднаўленую арганізацыйную работу спрод іх. Цэнтральны друк павінен узначаліць гэту работу, свайчасова выпраўляючы недахопы і скажэньні, якія бясспрэчна будуць мець месца ў гэтай справе. Асабліва важную ролю павінны адыграць у разгортваньні сумеснай работы «лісткі ЦКК і НК РСІ».

Асноўны ўпор у справе разгортваньня сумеснай работы на сёнешні дзень павінен быць зроблен на правядзеньне бальшавіцкай сяўбы.

Рашаючымі зьвеньнямі пасьляховай падрыхтоўкі да бальшавіцкай весны зьяўляюцца: збор пасеўных фондаў, прывядзеньне ў парадак трактарнага парку і цягавай сілы, выраб запасных частак для трактараў. Кожны актывіст РСІ, кожны рабкор павінен усёй сіламі змагацца за пасьпяховую падрыхтоўку да бальшавіцкай сяўбы, як за адно з важнейшых мерапрыемстваў партыі, адно з актуальнейшых пытаньняў дня.

Багацейшы вопыт даў рэйд, праведзены Вялікабурлукскай РКК РСІ (Украіна) сумесна з райгазэтай і украінскім карэспандэнтам «Правды» па падрыхтоўцы да сяўбы ў мінулым годзе. У гэтым рэйдзе прыняло ўдзел 5.772 калгаснікаў і рабочых саўгасаў. У рэйдзе прынялі актыўны ўдзел усе мясцовыя партыйныя, прафсаюзныя і камсамольскія арганізацыі. Напярэдадні рэйду арбыўся падрыхтоўчы раённы зьлёт, на якім прысутнічала звыш 1.000 калгаснікаў і рабочых саўгасаў. Толькі за пе ныя два дні было выпушчана звыш 200 рэйдавых лістовак. Для замацаваньня сапраўднасьці рэйду былі арганізаваны кантрольна - праверачныя брыгады. У результаце гэтага рэйду ўвесь раён дабіўся посьпеху ў сеяньні пасеўных ф

ПОСЬПЕХ СЯЎБЫ—У РУКАХ БРЫГАДЫ

УМАЦАВАЦЬ ПАСТАЯННЫЯ ВЫТВОРЧЫЯ БРЫГАДЫ У КАЛГАСАХ!

ЧЫЕ АГРЭХІ?

БАРЫСАЎ, 7. (Ад нашага спэцыяльнага карэспандэнта).

У раёне многія калгасы прыступілі ўжо да палявых работ. Трэцяга красавіка выйшлі ў поле на ворыва для ранняй сяўбы амаль усе калгасы Перасадскага, Глівенскага і Зембінскага сельсаветаў. У Зембінскім сельсавеце выйшлі арать працоўныя аднаасобнікі з вёсак Плаўнікі і Шарнікі. Некаторыя калгасы Кішчынаслабоджкага сельсавету пачалі раньнюю сяўбу лубіну.

Першыя дні выхаду ў поле ярка паказалі якасьць усёй папярэдняй падрыхтоўчай работы да веснавой сяўбы. Гэтыя дні лепш за ўсё характарызуюць і апэрацыйнасьць кіраўніцтва калгаснай вытворчасьцю з боку барысаўскіх раённых арганізацый.

Спынімся хоць-бы на калгасах Зембінскага сельсавету.

У рапарце зембінскіх кіраўнікоў, які быў зьмешчан нядаўна ў раённай газэце «Бальшавік Барысаўшчыны», чытаем аб мачагым выезьдзе ў поле наступнае:

«Усе калгасы гатовы да палявых работ. Заключан дагавор па сацыялістычнае спаборніцтва паміж калгасамі па лепшым правядзеньні сяўбы».

Якая-ж гатоўнасьць па справе?

Возьмем калгас «Ударнік». Тут калгасьнікі пачалі арать паліну яшчэ 1-га красавіка. 1 з першага-ж дня—агідна нізкае выкананьне норм ворыва.

Першы дзень працавалі ў полі чатыры аднакорпусныя плугі. Узарана... 0,63 га. У другі дзень на шасьці параконных і двух аднакорпусных плугох было ўзьнята 2,32 га паліны. У трэці дзень працавала на полі 11 пар: узаралі ўсяго... 3,5 га. Такім чынам нормы ворыва выконваюцца толькі на палову.

Ня лепшыя паказальнікі і ў калгасе «Серп і молат». Там за першы дзень шасьцю парамі ўзаралі ўсяго 1,5 га паліны, за другі дзень—1,32 га, а за трэці—яшчэ меншы.

Чаму такая нізкая прадукцыйнасьць?

Мясцовыя работнікі знаходзяць ты сячы прычын: то «коні не аб'ежджаны», то «плугі не абцёрліся» і г. д., і г. д. Хіба справа ў гэтым? Не. Зусім не!

У калгасе «Ударнік» аратыя з першага-ж дня на 5-6 разоў бегалі з поля ў кузьню, каб на хаду рамантаваць «поўнасьцю адрамантаваныя плугі». Амаль палова працоўнага дня працілася на тое, каб прыгнаць «зусім падрыхтаваныя хамуты». А як выходзілі на работу? Дрэнна, гашебна дрэнна. Выходзілі, як правіла, не раней 10 гадзін дня.

Нельга ня спыніцца і на саміх нормах выпрацоўкі. Ні ў адным калгасе, ни тольки аратыі і брыгадзір, але і сам старшыня калгасу ня ведаюць, як вызначыць нормы выпрацоўкі. І гэта цяпер—на пароге масавай сяўбы.

Сельсаветы абмежаваліся толькі тым, што далі старшыням калгасаў кніжкі з прыкладнымі нормамі выпрацоўкі, выданыя Наркамземам БССР. Раённыя арганізацыі таксама нічога не зрабілі, апроч таго, што паслалі гэтыя кніжкі ў сельсаветы.

Ніякіх указаньняў, як трэба карыс тацца прыкладнымі нормамі, ня было і няма.

Атрымаўшы прыкладныя нормы, у калгасах падышлі да іх па-роснаму. Так, праўленьне калгасу «Ударнік» палічыла, што гэтых норм зусім ня трэба абмяркоўваць. Калгас узяў за аснову леташнія нормы выпрацоўкі, хоць яны і праводзіліся ранейшым кулацкім кіраўніцтвам. Таму з першых-жа дзён на полі кожны калгасьнік працуе столькі, колькі ён хоча. Такой устаноўцы адпавядае і сама арганізацыя працы на ворыве.

Аратыя працуюць адзін за адным, гуськом. Загоны не замацаваны за паасобнымі калгасьнікамі. Зразумела, што пры такім становішчы нельга ўлічваць ні колькасьці, ні якасьці работы кожнага паасобнага аратага. Панове поўная ўраўнілаўка. Узаралі, напрыклад, 3,5 га і пачалі думаць, як будзе з аплатай. Думалі ня доўга. Падзялілі ўзараную плошчу на ўсіх калгасьнікаў, вось вам і аплата!

Ня лепш і ў калгасе «Серп і молат». Тут лодырам і прагульшчыкам добра жывецца. Напрыклад, для ворыва адналяменным плугам праўленьне калгасу вызначыла аднолькавую для ўсёй глебы норму ў 0,35 га. А аплату захавалі тую-ж, якую Наркамзем БССР вызначыў для нормы ў 0,6 га. Таксама зьменшаны амаль на 50 проц. з захаваньнем аплаты вышэйшых груп і нормы па ўсіх іншых палявых работах на час веснавой сяўбы.

Выйдзеце на ўзаранае поле калгасу «Серп і молат». Куды ні зірнеш—агрэх.

Чые яны?

Хто адказвае за агрэхі?

Невядома.

За аратымі тут таксама не замацаваны паасобныя загоны. Таму калгасьнікі і не зацікаўлены ў тым, каб павысіць колькасьць і якасьць апрацоўкі глебы.

— Трыццать пяць сотак кожны вы працуе,—разважаюць аратыя.

Як рэагуе на гэта сельсавет?

Сакратар парт'ячэйкі Ульяновіч і старшыня сельсавету Радзюк толькі тое і робяць, што складаюць прыгожыя рапарты. У раён адно за адным ляцяць паведамленьні аб разьвітаньні сацыялістычнага спаборніцтва паміж калгасамі на хутчэйшае правядзеньне сяўбы.

Гэта ў славесных дэкларацыях. А на справе ясна што ёсьць. Якая можа быць гутарка аб спаборніцтве пры поўнай абязьлічцы, пры поўнай ўраўнілаўцы.

Цяпер аб раённым кіраўніцтве. Яшчэ 3-га сакавіка барысаўскі райвыканком распрацаваў канкрэтны план правядзеньня палявых работ. У плане запісана ўсё — тут і графікі ўраджайнасьці, і ўказаньні аб арганізацыі брыгад, і г. д., і г. д. Але гэты прыгожы план і па сёньняшні дзень... не зацьверджан. Так і ляжыць ён у канцылярыях райвыканкому. Калі-ж план будзе спушчан на месцы, сельсаветы, у калгасы?!..

Многія калгасы, а ў Зембінскім сельсавеце ўсе, яшчэ ня маюць вытворча-фінансавых плянаў. Брыгады выходзяць па палявыя работы, ня ведаючы колькі і якіх культур яны павінны засеяць, які іх графік ураджай насьці. Аднак, ні райком, ні райземаддзел не аказалі ніякай дапамогі для калгасаў у складаньні плянаў.

Што робіцца ў паасобных калгасах—у раёне ведаюць менш за ўсё. Возьмем, напрыклад, той-жа калгас «Серп і молат», Зембінскага сельсавету. Тут у мінулым годзе было праведзена, па сутнасьці, шкодніцкае зямляўпарадкаваньне. Лепшыя землі адрэзаны ад калгасу, а сам калгас туліцца на краёх, яго палі раскінуты рознымі дробнымі кавалкамі. Калгасу патрэбна тэрміновая дапамога. Райземаддзел, аднак, і па сёньняшні дзень не паслаў туды каморніка.

У раёне паасобныя калгасы яшчэ і да гэтага часу ня ссышалі поўнасьцю насенных фондаў. Так, калгас «Чырвоны дуб», Глівенскага сельсавету, яшчэ і цяпер ня скончыў ссыпкі, аўса, грэчкі, слашчэніка і бульбы. За тое ў калгасе ёсьць лішкі насеннага ячменю, жыта, вікі, капюшыны і інш. культур. Калгас ужо разгарнуў палявыя работы, а абмен насеньня яшчэ ня зроблен. Райземаддзел не аказвае ніякай дапамогі. Работнікі земаддзелу на пытаньня запытаньні калгасаў аб абмене насеньня даюць адзін і той-жа стэрэатыпны адказ:

— Шукайце самі.

Ня маюць калгасы канкрэтнай дапамогі і ў арганізацыі работы ў брыгадах. Адсюль блытаніна, шматлікія памылкі. У калгасе «Чырвоны гай», напрыклад, 160 калгасьнікаў разьбіты на двух брыгады—па 80 чалавек у кожнай. Хіба-ж зможа добра брыгадзір кіраваць такой вялікай прамоздкай брыгадай? Палі севазвароту паміж брыгадамі размежаваны механічна, кожнай брыгадзе — па палове.

Такавы вынікі кіраўніцтва паогул, кіраўніцтва славесна-дэклярацыйнага, кіраўніцтва з габінэтаў.

У тым, што ўжо на печных узораных гэктарах на палёх Барысаўшчыны ёсьць шмат агрэхаў, вінават у першую чаргу барысаўскі райком.

А. СУЧКОВА.

А АПЛАТА ТАЯ-Ж...

ЖЛОБІН, 6. (Ад нашага спэцыяльнага карэспандэнта).

Калгас **«НОВАЕ ЖЫЦЬЦЁ»** лічаць у раёне адным з самых лепшых і перадавых калгасаў. Чаму? У раёне спасылаюцца на тое, што калгас нібы ўзорна падрыхтаваўся да сяўбы. Ссыпаны насеннфонды. Скончан рамонт інвэнтару. Ёсьць 48 добрых працаздольных коняй.

Але...

4-га красавіка калгас першы раз выйшаў у поле. Палявыя работы ў калгасе пачаліся. Як яны праходзяць, як яны арганізаваны? Пакажам на прыкладзе аднаго дня.

5 красавіка. Дзьве паляводчыя брыгады калгасу «Новае жыцьцё» павінны выйсьці на ворыва і вазіць гной.

Раніца. На калгасным двары пуста і ціха — ні жывой душы. Бяз усякага парадку, дзе папала стаяць калёсы. Тут-жа валяюцца плугі. Увесь інвэнтар скінут у адну кучу. Дзе плугі першай і дзе другой брыгад — ніяк не разьбярэш.

9 гадзін. На двары зьяўляюцца два калгасьнікі. Ні аднаго брыгадзіра няма. Праз паўгадзіны прыходзіць яшчэ некалькі чалавек. Людзі садзяцца, гутараць, закурваюць. Парэпце, прыходзяць і брыгадзіры.

Калгасьнікам падакучыла чакаць. Запытваюць брыгадзіра першай брыгады:

— Ульян, чаго чакаеш?

Ульян маўчыць.

— Давай людзям работу!

Калгасьнікі падумалі і самі рушыліся да кладоўкі за збруяй. Парашылі запрагаць коняй, не чакаючы тых, хто позьніцца.

У кладоўцы сабраліся калгасьнікі двух брыгад. Шум, спрэчкі, мітусьня.

— Дзе-ж гэта мой хамут?

— Хто ўзяў мой сядзельнік?

— Ты супоню выцягнуў?

Нарэшце, коняй запраглі. Але ніхто ня рушыцца з месца. Ніхто ня ведае куды ехаць, на якое поле.

— Ульян, куды мне ехаць? — запытвае калгасьнік Выдранкоў у брыгадзіра.

— Пачакай, зьбегаю даведацца ў старшыні калгасу.

— Эх, колькі-б я ўжо ўзараў — абураецца Выдранкоў.

Толькі ў 10 з паловай гадзін частка калгасьнікаў, парэпце, выехала ў поле.

У чым-жа справа? Адкуль у калгасе, які раённыя арганізацыі лічаць лешшым, такія злачынныя факты?

Людзі проста штампавалі рапарты аб гатоўнасьці да сяўбы, але не правяралі як калгас на справе падрыхтаваўся да палявых работ, як арганізаваны яго брыгады.

Што-ж у сапраўднасьці ёсьць у калгасе? Як арганізаваны і працуюць яго пастаянныя вытворчыя брыгады?

Праўленьне доўга ня думала. Усе калгасьнікі былі разьбіты на дзьве аднолькавыя групы. Гэтыя групы і названы пастаяннымі брыгадамі. Інвэнтар і цягавую сілу таксама падзялілі пароўну. Кожнай брыгадзе далі аднолькавую колькасьць плугоў, коняй і г. д. Падзялілі пароўну і яравы клін. Першая брыгада павінна ўзараць і засеяць столькі-ж, колькі і другая з дакладнасьцю да сотай гэктара.

Калгас павінен, напрыклад, засеяць 0,5 га цыбулі. Адсюль першая брыгада атрымала заданьне засеяць 0,25 га і другая таксама 0,25 га.

А вось, як у калгасе разьмеркаваны палі? Усе палі разьбіты на самыя дробныя кавалкі. Брыгадам адведзена зямля не ў адным-двух масывах, а па кавалках. Адзін кавалак знаходзіцца ад другога на адлегласьці некалькіх кілёмэтраў. Палі першай і другой брыгады перабытаны. Праўленьне разам з аграномам МТС, каб «ніхто ня крыўдзіўся», для першай брыгады адвяло карлікавыя кавалкі на палёх другой брыгады і наадварот. І выйшла, што калгасьнікі і першай і другой брыгад проста ня ведаюць, дзе ім і што арать і сеяць. Людзям прыходзіцца бегчы з аднаго канца ў другі за некалькі кілёмэтраў і шукаць, дзе праводзіць ворыва.

Да сёньняшняга дня брыгадзіры так і ня ведаюць дакладна, дзе-ж зямельныя вучасткі іх брыгад. Што-ж з гэтага выйшла, паказваюць першыя дні работы ў поле. Перад кожным выхадам у калгасе адбываюцца адны і тыя-ж гутаркі.

Аратыя брыгадзірам:

— Дзе арать?

Брыгадзіры аратым:

— Ня ведаем, трэба запытацца ў Лаўрэна (старшыня калгасу).

І ў выніку сотні гадзін злачынна трацяцца на бескарысныя пераезды з поля на поле, з аднаго кавалка зямлі на другі.

У брыгады залічаны пераважна жанчыны і падлеткі. Затое частка працаздольных дарослых калгасьнікаў засядае ў калгасе. Многія падлеткі яшчэ ні разу не хадзілі за плугам, а іх пасылаюць на ворыва. Вось, напрыклад, падлеткі Сямён, Рыгор і Фёдар Аўсяньнікавы. Ніколі яны яшчэ не аралі. Цяпер-жа ім даручылі ворыва. І выходзіць, што-ні-баразна, то агрэх. Як-жа яны будуць арать, калі і плуга яшчэ, як сьлед трымаць ня ўмеюць.

Праўленьне калгасу палыйнула па гэтай справы са злачынай безадказнасьцю. Яму ня важна, хто будзе арать, важна, каб у кожнай брыгадзе была аднолькавая колькасьць аратых. Па-другое, тут ясна як на далоні шкаднейшая тэндэнцыя паслаць у поле падлеткаў, а ў калгасе пакінуць дарослых вопытных калгасьнікаў.

У калгасе панує кулацкая ўраўнілаўка і гультаі, і лепшыя калгасьнікі — на адным рахунку.

Вось калгасьнік Калініньнікаў. Гэта вядомы гультай. 5 красавіка, напрыклад, ён зьявіўся ў поле самым апошнім, пасьля 11 гадзін. І так кожны раз.

Паглядзеце на паліну, узараную Калініньнікавым. Адны агрэхі, не арэ, а псуе зямлю.

А вось калгасьнік Выдранкоў. Гэта лешшы аратый калгасу.

Якая-ж аплата?

Аына і тая-ж, што і для Калініньнікава.

Калініньнікаву запісваюць столькі-ж працадзён, колькі і Выдранкову. Чаму? Аказваецца толькі таму, што і той і другой робяць адну справу — арэуць зямлю.

Адсюль і якасьць працоўнай дысцыпліны. У першай брыгадзе з 42 чалавек 4-га красавіка выйшлі на работу толькі 19, а 5-га — усяго 8. Нормы ворыва выконваюцца ня больш, як на 50-60 проц.

Усе факты, названыя намі — справа рук старшыні калгасу Лупсякова, агранома МТС Вярбіцы і загадчыка вытворчага вучастку МТС Аўсяньнікава. Гэта яны так злачынна сказілі дырэктывы аб арганізацыі брыгад, гэта яны так разьмеркавалі палі ў калгасе.

І справа тут ня толькі ў адным калгасе «Новае жыцьцё». Вярбіца і Аўсяньнікаў дакладна па такіх-жа прынцыпах правялі арганізацыю брыгад і ў 12-ці іншых калгасах раёну. Можна сабе ўявіць, што яны там нарабілі!

Гэта — трывожнейшы і небясьпечнейшы факт. Справы Вярбіцы, Лупсякова і Аўсяньнікава льлюць ваду толькі на млын кулака і ставяць пад пагрозу сяўбу.

Што-ж робяць жлобінскія райком, райвыканком і райземаддзел? аб чым яны думаюць, пяўжо-ж яны нічога ня бачаць, што робіцца ў іх пад носам? Няўжо-ж яны не заўважваюць тых агідненьких злачынных скажэньняў, якія дапускаюцца ў Жлобінскім раёне пры арганізацыі брыгад?

Як бачыце, не заўважваюць!

Патрэбны самыя тэрміновыя, самыя рашучыя меры!

Л. Ч.

ЖЛОБІН.

БРЫГАДЫ ПЕРАВЫКОНВАЮЦЬ НОРМЫ ВОРЫВА

БАБРУЙСК, 5.

ПЕРАДАВЫЯ КАЛГАСЫ ПРЫСТУПАЮЦЬ ДА СЯЎБЫ. ПЕРШЫМІ ВЫЙШЛІ Ў ПОЛЕ КАЛГАСЬНІКІ С.-Х. АРЦЕЛІ «ПРАЛЕТАРЫ», ХІМАЎСКАГА СЕЛЬСАВЕТУ. ПАЛЯВОДЧАЯ БРЫГАДА ГЭТАГА КАЛГАСУ ВЫЕХАЛА Ў ПОЛЕ НА ВОРЫВА 1 КРАСАВІКА. 5 ГЭКТАРАЎ УЖО ЎЗАРАНЫ.

ПЕРШАГА-Ж КРАСАВІКА ПАЧАЛІ ВОРЫВА І ПААСОБНЫЯ КАЛГАСЫ КАВАЛЕЎСКАГА СЕЛЬСАВЕТУ. КАЛГАС «13-ГОДЗЬДЗЕ КАСТРЫЧНІЦКАЙ РЭВАЛЮЦЫІ» УЗАРАЎ 3 ГЭКТАРЫ.

УЗОРНА ПАДРЫХТАВАЛІСЯ ДА СЯЎБЫ БРЫГАДЫ КАЛГАСАЎ «ІДЗІ ЛЕНІНА» І «ПЕРШЫ МАЙ», МАЛЕЎСКАГА СЕЛЬСАВЕТУ. ГЭТА ЯРКА ПАКАЗАЎ ПЕРШЫ ВЫХАД КАЛГАСАЎ У ПОЛЕ. БРЫГАДЫ СВАЯЧА СОВА ЗЬЯВІЛІСЯ НА ПРЫМАЦАВАНЫЯ ДА ІХ ЗЯМЕЛЬНЫЯ ВУЧАСТКІ З ЦЯГАВАЙ СІЛАЙ І С.-Г. ІНВЭНТАРОМ.

НОРМЫ ВОРЫВА ПЕРАВЫКОНВАЮЦЦА. БРЫГАДА ФРАМОВІЧА ЎЗАРАЛА 8 ГЭКТАРАЎ, ПРЫ ЧЫМ НОРМЫ ВЫПРАЦОЎКІ БЫЛІ ПЕРАВЫКАНАНЫ. ПАМІЖ БРЫГАДАМІ ЗАКЛЮЧАНЫ САЦЫЯЛІСТЫЧНЫЯ ДАГАВАРЫ НА ЛЕПШАЕ ПРАВЯДЗЕНЬНЕ ВЕСНАВОЙ СЯЎБЫ.

БРЫГАДЫ ПА-БЫХАЎСКУ

БЫХАЎ, 6. (Наш кар.).

Перадавыя калгасы раёну прыступілі да палявых работ. Набліжаецца масавая сяўба. Гэта, аднак, вельмі мала турбуе раённыя арганізацыі і асабліва райземаддзел.

Ня будзем галаслоўнымі. Калгасы яшчэ і зараз ня маюць канчатковых пасеўных плянаў. Апошні плян раён атрымаў ад Наркамзему 25 лютага. Але і гэты плян да калгасаў не даведзен. Загадчык райземаддзелу Кучараў лічыць, што калгасы... могуць і так засеяць.

Насеньня збожжавых трэба ссыпаць 17.585 цэнтн. яравых. Ссыпка насеньня ў раёне спынілася, але плян ня выкананы. Нават паводле зводкі райземаддзелу збожжавых ссыпана 92 проц., фактычна-ж ссыпана значна менш. Дакладную колькасьць ссыпанага насеньня ніхто ня ведае, бо лічбы насенных фондаў па сельсаветах мяняюцца літаральна кожны дзень.

Напрыклад, калгасы Ісконскага сельсавету за пяцідневку зьменшылі колькасьць ссыпанага насеньня на 297 цэнтн., калгасы Бархалабаўскага сельсавету зьменшылі на 34 і Гарадзецкага сельсавету — на 240 цэнтн. яравых. Дзе-ж раней ссыпанае насеньне—ніхто ня ведае — ні райком, ні РВК, ні райземаддзел. Яны наогул ня ведаюць, што робіцца ў калгасах і толькі займаюцца тым, што выдаюць пастановы. А як гэтыя пастановы праводзяцца ў жыцьцё — гэтым ніхто ня цікавіцца.

За апошнія месяцы ў раёне арганізавана 12 новых калгасаў. У старыя калгасы ўступіла 590 гаспадарак. Райземаддзел і па сёньняшні дзень нічога ня робіць, каб зямляўпарадкаваць новыя калгасы і прырэзаць да старых калгасаў зямлю новаўступіўшых калгасьнікаў, і гэта — перад пачаткам масавай сяўбы.

Посьпех сяўбы ў калгасе вырашаецца ў пастаяннай вытворчай брыгадзе. У Быхаве да арганізацыі пастаянных калгасных брыгад падыйшлі безадкладна і фармальна. Райземаддзел абмежаваўся агульнай дырэктывай, бяз усякіх канкрэтных указаньняў.

У выніку ў большасьці калгасаў брыгады арганізаваны толькі на час сяўбы. Ёсьць калгасы, дзе склад брыгад мяняецца амаль штодзенна. Напрыклад, у калгасе «Ленінская ніва», Ісконскага сельсавету, тры разы мянялі склад брыгад і дагэтуль брыгады не аформлены. У калгасе імя Калініна спачатку арганізавалі тры брыгады на час веснавой сяўбы, потым іх распусьцілі, а пастаянных брыгад так і не арганізавалі.

Аб якасьці кіраўніцтва калгасамі сьведчыць наступны факт. Райземаддзел даў калгасу імя Калініна плян засеяць 324 га. Ня гледзячы на гэта, яравы клін калгасу нядаўна абрэзалі і 52 га перадалі калгасу «Наказы Ільліча». Другой зямлі калгасу імя Калініна не далі, а пасеўнае заданьне засталося ранейшым. Так ажыцьцяўляюць у Быхаве катэгарычныя дырэктывы ўраду аб забароне парушаць калгаснае зямлякарыстаньне.

Для поўнага малюнку застаецца дадаць наступнае. У райземаддзеле ёсьць 6 інспэктароў. Фармальна іх прымацавалі да сельсаветаў. Але работу Інспэктароў ніхто не правярае. Інспэктары робяць, што яны хочуць.

Інспэктар Лаўрэнеў, напрыклад, замест работы ў сельсавеце замест дапамогі калгасам ужо пяты дзень сядзіць у горадзе. Іншыя Інспэктары таксама пераважна знаходзяцца ў горадзе, а не ў сельсавеце, не ў калгасе.

НЭЙДЛІН.

Н. ЛЕНЦНЭР

АСНОЎНАЕ ЗЬВЯНО У БАРАЦЬБЕ ЗА БАЛЬШАВІЦКУЮ КАЛГАСНУЮ СЯЎБУ

Наша БССР — напярэдадні сяўбы. Сяўба гэтага году сапраўды ГІСТАРЫЧНАЯ сяўба. Сяўба гэтага году, па-другое, АСАБЛІВАЯ сяўба, бо яна пройдзе пад знакам таго, што партыя «лавіна цяпер узяць у свае рукі кіраўніцтва калгасамі, прыняць на сябе адказнасьць за работу і дапамагчы калгасьнікам весьці сваю гаспадарку наперад на аснове даных навукі і тэхнікі» (СТАЛІН). Але «калгас ёсьць буйная гаспадарка. Буйную гаспадарку нельга весьці без плану. Буйная гаспадарка ў зямляробстве можа весьціся толькі ў парадку плянавага кіраўніцтва. БЯЗ ГЭТАГА ЯНА ПАВІННА ЗАГІНУЦЬ І РАЗВАЛІЦЦА» (СТАЛІН—падкрэсьлена намі).

Бальшавіцкае кіраўніцтва калгасамі — гэта, стала быць, плянавае кіраўніцтва. КАЛГАСНЫ ПЛЯН павінен ляжаць у аснове нашага кіраўніцтва калгасамі. Іменна з гэтага пункту гледжаньня мы павінны падыйсьці да ацэнкі кіраўніцтва кожнага раёну, кожнай МТС, кожнага калгасу. Іменна зараз, калі мы стаім напярэдадні сяўбы. ВЫТВОРЧЫ КАЛГАСНЫ ПЛЯН — асноўная ўмова АРГАНІЗАВАНАЙ БАЛЬШАВІЦКАЙ СЯЎБЫ. Нельга пра водзіць важнейшую гаспадарча-палітычную кампанію ўсьляпую. Вытворчы калгасны плян важны перш за ўсё тым, што ён дае ясную пэрспэктыву росту калгасу, наглядна паказвае, што МОЖА даць калгас, калі добрасумленна і чэсна працаваць. Вытворчы плян, у якім дан падлік даходаў і расходаў, з якога выцякае, колькі кожны калгасьнік зможа атрымаць на працадзень, калі калгас дасягне добрага ўраджаю, — найвялікшая зброя ў барацьбе за працоўную дысцыпліну, за ўдарныя тэмпы сяўбы, за павышэньне ўраджайнасьці.

Хіба той падпік, які зрабілі безанчукскія калгасьнікі, падпік, які зводзіўся да таго, што пры ўраджаі ў 11 цэнтнэраў (ураджай вельмі сярэдні ў пераўзьбярэжжы Волгі) на кожны працадзень прыпадзе звыш 8 кгр. збожжа, не зьяўляецца найвялікшай зброяй у барацьбе за сяўбу. І хіба ў нас, у кожным калгасе, калі падлічыць, што калгасьнік зможа атрымаць пры добрым ураджаі, ня будзе той-жа вынік, што на кожны працадзень прыпадзе ЗНАЧНА БОЛЬШ збожжа, бульбы, чым у мінулым годзе, Нельга весьці мільённую армію калгасьнікаў і калгасьніц у веснавы бой, не паказаўшы наглядна ў КОЖНЫМ калгасе, ЗА ШТО мы б'емся ў цяперашнюю сяўбу. А гэтага зрабіць нельга, ня маючы вытворчага пляну.

Вытворчы плян — адна з рашаючых умоў, «якая ў КОРАНІ адрозьнівацца ад умоў вядзеньня аднаасобнай дробнай гаспадаркі» (СТАЛІН). Вытворчы плян дае магчымасьць загадзя вызначыць, ШТО будзе сеяць калгас, ДЗЕ ён будзе сеяць, ЯК будзе сеяць.

Вытворчы плян дае магчымасьць загадзя скласьці плян ПАДЗЕЛУ ПРАЦЫ Ў СЯЎБЕ, ПЛЯН РАССТАНОЎКІ ЛЮДЗЕЙ. Вытворчы плян дае магчымасьць загадзя вызначаць, ЯКІЯ КУЛЬТУРЫ Ў ЯКІ ТЭРМІН і дзе лепш за ўсё сеяць.

Правільна сказаў тав. ЯКАЎЛЕЎ на ўсесаюзным зьезьдзе калгасьнікаў-ударнікаў, што калгас БЯЗ УЛІКУ, БЯЗ ПЛЯНУ, ШТО ДОМ БЕЗ ДЗЬВЯРЭЙ. На жаль, трэба адзначыць, што па нашай БССР ёсьць яшчэ ТЫСЯЧЫ калгасаў, якія ня маюць вытворчых плянаў. Паводле даных Наркамзему на 3 красавіка па 62 раёнах, даўшых весткі аб вытворчых плянах, толькі 56 проц. калгасаў маюць вытворчыя пляны. Што можна сказаць аб такіх раёнах, як Полацкі, Крупскі, Дубровенскі, Лагойскі, Асіпавіцкі, Крычаўскі, Чырвонапольскі, Жлобінскі, Парыцкі, Камарынскі, Аршанскі, дзе менш 40 проц. калгасаў склалі вытворчыя пляны. Што можна сказаць аб АРШАНСКІМ раёне, які, маючы 45 аграномаў (уключаючы саўгасных), на 25 сакавіка меў толькі 32 вытворчыя пляны (пры, чым на паперы, бо на справе, пры праверцы іх аказалася значна менш). Аб кіраўніцтве гэтых раёнаў можна сказаць толькі адно — яно не зразумела гістарычных указаньняў тав. Сталіна, не зрабіла неабходных вывадаў у сваёй практычнай рабоце.

Але нам патрэбен ня ўсякі вытворчы плян. Толькі той плян дапамагае барацьбе за бальшавіцкія калгасы, дапамагае барацьбе за ажыцьцяўленьне пёзунгу правадыра «арабіць усіх калгасьнікаў заможнымі», які грунтуецца на сьцісных тэрмінах сяўбы, на севазвароце, на ўжываньні праніп агратэхнікі, на сьцягу якога напісан высокі ўраджай.

Між тым, факты гавораць аб тым, што па цэлым радзе калгасаў вытворчы плян будуецца не на гатых бальшавіцкіх асновах, што да складаньня вытворчых плянаў прыклалі руку кулацкія, шкодніцкія элементы. На самой справе, чым, як ня кулацкай работай можна лічыць вытворчы плян калгасаў «Пражэктар», «Новыя сыліжы», Шклоўскага раёну, дзе запраектавана ўраджайнасьць па ільна-валакне ў 1,2 цэнтн. з га, а ў калгасе «Воля», гэтага-ж раёну — нават 1,1 цэнтн., ураджайнасьць аўса і пшаніцы — у 4 цэнтн. («Новыя сыліжы»), хаця і старшыні калгасаў і дырэктар МТС абавязаны былі ведаць, што КП(б)Б і ўрад БССР устанавілі ўраджайнасьць па ільна-валакне ў 2,4 цэнтн., па збожжавых — у 8 цэнтн. з га.

Чым, як ня шкодніцкай работай можна лічыць рэзкае ПАДАЎЖЭНЬНЕ ТЭРМІНАЎ сяўбы па раду калгасаў (напрыклад, калгас «Церахаўка», Церахаўскага раёну, тэрмін сяўбы расьцягнут з 15 да 35 дзён; у калгасе «Ўраджай» скавчэньне сяўбы аднесена да 10 чэрвеня і г. д.). Хіба можна лічыць бальшавіцкімі такія вытворчыя пляны, якія не ахапляюць сабой асноўных агратэхнічных мерапрыемстваў па павышэньні ўраджайнасьці, ня грунтуюцца на севазвароце. Значны лік скажэньняў у складзеных вытворчых плянах, якія пераходзяць у радзе выпадкаў у простае шкодніцтва, магло мець месца толькі ў моц таго, што райза аднесьліся, як правіла, да гэтай работы фармальна-бюракратычна, штам пуючы або зусім не праглядаючы гэтых плянаў, што многія РК і РВК, сьледуючы саноўна-бюракратычным мэтадам кіраўніцтва, не папічылі для сябе патрэбным узяць у свае рукі такую важнейшую гаспадарча-палітычную кампанію, як складаньне калгасных вытворчых плянаў.

КІНУЦЬ УСЕ СІЛЫ НА ЛІКВІДАЦЫЮ ПРАРЫВУ З ВЫТВОРЧЫМІ ПЛЯНАМІ, НЕАДКЛАДНА ВЫПРАВІЦЬ СКАЖЭНЬНІ І КУЛАЦКАЕ ШКОДНІЦТВА Ў ПААСОБНЫХ ПЛЯНАХ — такая задача дня, без выраўшэньня якой нельга з посьпехам пачаць і правесьці сяўбу.

Вытворчы плян НЕЛЬГА АДДЗЯЛІЦЬ АД КАЛГАСНАЙ БРЫГАДЫ. Вытворчы калгасны плян без калгаснай брыгады (гутарка ідзе аб калгасах, якія ядноюць звыш 15 гаспадарак) таксама нерэальны, як, скажам, прамфінплян на цяперашнім прадпрыемстве бяз вытворчай брыгады.

Вытворчы плян, за якім ня сьледуе стварэньне калгаснай брыгады, — гэта ПАПЯРОВЫ, бюракратычны дакумант.

Што значыць калгасная брыгада — гэта яркa гавораць нам вопыт Паўночнага Каўказу, Украіны, Крыму, распачаўшых сяўбу яшчэ ў сакавіку.

У чым галоўны ўрок, якія асноўныя недахопы, выяўленыя ў ходзе сяўбы, скажам, Паўночнага Каўказу?—У тым, што цэлы рад КАЛГАСАЎ УВАЙШЛІ Ў СЯЎБУ НЕАРГАНІЗАВАНА, ШТО ВА МНОГІХ КАЛГАСАХ ПАСТАЯННЫЯ ВЫТВОРЧЫЯ БРЫГАДЫ АКАЗАЛІСЯ на паперы, аказаліся бяз вытворчых вучасткаў, што многія калгасныя брыгады былі створаны фармальна, бюракратычна — сілы ня былі правільна расстаўлены, вучасткі ня былі загадзя намечаны. У выніку — мітусьня, непарадак, нізкія нормы выпрацоўкі, паніжаныя тэмпы сяўбы, зрыў графіку.

А што мы маем у нас, у БССР?

ТРЭБА ПРОСТА, ПА-БАЛЬШАВІЦКУ СКАЗАЦЬ, ШТО КАЛІ МЫ Ў БЛІЖЭЙШЫЯ ДНІ НЯ ВЫПРАВІМ СПРАВУ З КАЛГАСНЫМІ БРЫГАДАМІ, МЫ ТРАПІМ У СТАНОВІШЧА, НЯСУМНЕННА, ГОРШАЕ, ЧЫМ ГЭТА МАЕ МЕСЦА З ЦЭЛЫМ РАДАМ КАЛГАСАЎ Паўночнага Каўказу і Украіны.

На самой справе, паводле даных НКЗ, на 3 красавіка створана толькі па 23 раёнах 1.861 брыгада, плян пакуль што выкананы на 63,1 проц. Калі ўзяць усе 75 раёнаў, то процант, бязумоўна, зьніжацца. Ёсьць раёны, як Асьвейскі, Горацкі, Мсьціслаўскі, Дзяржынскі, Аршанскі і г. д., дзе брыгад створана пакуль што менш, чым складзена вытворчых плянаў.

Гэта значыць, што многія калгасы на паперы склалі вытворчыя пляны, А НА СПРАВЕ ДА СЯЎБЫ ПА-БАЛЬШАВІЦКУ НЯ РЫХТУЮЦЦА. Гэта значыць, што цэлы рад РК і РВК у сваіх разапоцыях, урачыста цытуючы прамову тав. Сталіна, НА СПРАВЕ праяўляюць апартуністычную бязьдзейнасьць у АРГАНІЗАЦЫІ СЯЎБЫ.

На самой справе. Чаму Лепельскі, Плешчаніцкі, Чырвона-Слабодзкі, Чэрвеньскі, Клімавіцкі, Старобінскі і інш. РК і РВК маглі дабіцца таго, што ў калгасах іх раёнаў брыгады створаны амаль на 100 проц., а Дубровенскі, Лагойскі, Аршанскі і інш. раёны гаснебна цягнуцца ў хвасьце, маючы толькі 10-30 проц. Вытлумачыць гэта толькі тым, што РК і РВК апошніх раёнаў па-ранейшаму спадзяюцца на самацёк.

Але было-б лёгкадумным, абсалютна шкодным, калі-б мы сталі на той пункт попаду, што СТВАРАНЫЯ брыгады ва ўсіх выпадках адпавядаюць бальшавіцкім прынцыпам іх пабудовы. На справе мы маем значную колькасьць скажэньняў.

Што значыць па-бальшавіцку, а не фармальна-бюракратычна правесьці работу па стварэньні пастаянных вытворчых брыгад? Гэта значыць, па-першае, стварыць брыгады на па мэханічным прынцыпе падзелу ўсіх працаздольных у калгасе на 2-3 частні, а адпаведна тым вытворчым вучасткам, якія павінны быць названы ў калгасе, асабліва ў сувязі з севазваротамі, якія ўводзяцца. Стварыць брыгады, ня ўлічваючы гэтых вытворчых вучасткаў, тым больш стварыць брыгады, не прымацоўваючы іх да пэўных вытворчых вучасткаў, — гэта значыць сьвядома скажаць дырэктывы партыі, гэта значыць загадзя рыхтаваць непарадкі, загадзя зрываць выразную работу ў дні сяўбы.

**Брыгада, якая ня ведае свайго вытворчага вучастку, ня можа ні правільна расставіць свае сілы, ні вызначыць выразнага каляндарнага пляну работы. Гаварыць аб старых тэрмінах сяўбы і ў той-жа час не прымацоўваць брыгад да пэўных вытворчых вучасткаў, — гэта значыць займацца

ЗАБАРОНА УВОЗУ САВЕЦКІХ ТАВАРАЎ

НОВЫ ЗАКОН АНГЕЛЬСКАГА ЎРАДУ

ЛЕНДАН, 5. Агенцтва «Рэйтар» паведамляе: «Біль аб забароне імпарту савецкіх тавараў увосан сёньня ідэнам (гав. міністара замежных спраў) у палату абшчын. Першае чытаньне адбылося бяз спрэчак. Першы артыкул дае права забараняць шляхам дэкрэту імпарт у Англію якіх-бы там ні было тавараў, вырабленых ці перапрацаваных у СССР, ці якой-небудзь катэгорыі або намэнклятуры падобных тавараў, дакладна ўказаных у дэкрэце.

Другі артыкул датычыць правёл прадастаўленьня ліцэнзій. Міністэрства гандлю будзе мець права дазваляць шляхам ліцэнзіі ці то агульны імпарт, ці імпарт у пасобных выпадках тых або іншых тавараў ці катэгорый тавараў, або намэнклятур, забароненых на падставе дэкрэту, акрэдна першага артыкулу біля.

Трэці артыкул датычыць выпадкаў невыкананьня кантрактаў у выніку дэкрэту, які прадугледжваецца артыкулам першым. Артыкул указвае, што ў выпадку іску супроць каго-небудзь з прычыны невыканаўнасьці якога-небудзь кантракту, адказчыку будзе даволі даказаць, што невыкананьне выклікана дэкрэтам, прадугледжаным біллем.

Чацьверты і апошні артыкул устанаўляе, што біль уступае ў сілу з 8-га красавіка.

Перад другім чытаньнем законапраекту аб забароне савецкага ўвозу Саймон заявіў, што гэты законапраект мае на ўвазе толькі прадастаўленьне ўраду адпаведных паўнамоцтваў і не прадугледжвае ажыцьцяўленьня гэтых паўнамоцтваў, якія ва ўсякім выпадку ня могуць быць ужыты ранэй 18 красавіка, калі скончыцца тэрмін гандлёвага дагавору.

Урад лічыць пажаданым, каб гэтыя паўнамоцтвы былі прадастаўлены яму ва вялікадных канікул. Даўшы агляд гандлёвых перагавораў, якія удала разьвіваліся, Саймон закрануў апошнія падзеі ў сувязі са справай кампаніі «Мэтраполітэн-Віккерс», падкрэсьліваючы пры гэтым тое значэньне, якое гэта кампанія займае ў Англіі. Саймон заявіў, што «хаця паміж поўнамоцтвамі, прадугледжанымі гэтым законапраектам, і маскоўскім працэсам непасрэдная сувязі няма, усё-ж я хацеў-бы ведаці, якія дзеяньні, па думцы палаты, павінен прадпрыняць брытанскі ўрад, атрымаўшы інфармацыю аб небясьпецы, пагражаючай ангельскім грамадзянам. Палата абшчын павінна разгледзець пытаньне, ці можа яна прадаставіць ураду паўнамоцтвы, якія, прынамсі, непасрэдна і бясспрэчна дзелі-б зразумець савецкім уладам, што меры, якія яны прымаюць, і трывога, якую выклікаў лёс гэтых падсудных, сапраўды зрабілі для нас немагчымым весьці перагаворы аб гандлёвых дагаварох».

У заключэньне Саймон зноў прасіў палату абшчын згадзіцца з тым, што калі больш нічога нельга зрабіць для аказаньня дапамогі брытанскім грамадзянам, якія знаходзяцца ў небясьпецы, дык, прынамсі, палата абшчын павінна даць ураду гэтыя паўнамоцтвы і даручыць яму карыстацца імі з асьцярожнасьцю і ў інтарэсах гэтых людзей.

Лейбарыст СТАФОРД-КРЫПС унёс рэзалюцыю з поваду апублікаванай «Белай кнігі» (ангельскі ўрад апублікаваў «Белую кнігу», якая зьмяшчае перапіску паміж ангельскім паслом у Маскве Овіем і ангельскім урадам у сувязі са справай арыштаваных інжынэраў «Мэтраполітэн Вікерс»). У рэзалюцыі ўказваецца, што «Белая кніга» не зьмяшчае выстарчальных падстаў, якія далі-б права ўраду патрабаваць вызваленьня служачых «Мэтраполітэн Віккерс» бяз суда, ці даваді-б права прадаставіць ураду прыняць рэпрэсіўныя меры супроць савецкага ўраду накшталт тых выключных паўнамоцтваў аб забароне ўвозу, як гэта прапануецца ў біле.

КРЫПС заявіў, што ён хацеў-бы па меры магчымасьці ўнікнуць усякага перапавялічэньня, якое толькі магло-б абвастрыць становішча, і без таго досыць напружанае. Ён лічыць, што няма ніякіх падстаў для рэпрэсій.

— Зусім ясна, — заявіў Крыпс, — што КАЛІ ПАДОБНАЯ СПРАВА МЕЛА-Б МЕСЦА Ў ІНШАЙ КРАІНЕ, А НЕ Ў РАСІІ, ДЫК НІЯКІЯ РЭПРЭСІІ НЯ БЫЛІ-Б УЖЫТЫ.

КІРКВУД (лейбарыст) заявіў, што ў «Белай кнізе» няма нічога такога, што апраўдвала-б надзвычайныя меры. Было-б страшнай трагедыяй спыніць гандлёвыя зносіны з Расіяй пры сучаснай кан'юнктуры. Расія, — закончыў Кірквуд, — была гатова разьмясьціць заказы на мільёны фунтаў стэрлінгаў у цяжкай прамысловасьці і да гэтага часу яна выконвала ўсе свае абавязацельствы.

МЭКСТОН (незалежны) сказаў, што ён напежыць да тых, якія хочуць, каб вялікі экспэрымэнт рускага народу быў даведзен з посьпехам да канца. Але разам з тым ён павінен канстатаваць, што агульны дух выступленьняў за апошнія тыдні гаворыць аб тым, што значная колькасьць членаў палаты вельмі хоча таго, каб гэты экспэрымэнт пацярпеў паражэньне.

Кансэрватар КРУКШЭН (прадстаўнік акругі, якая вядзе буйны гандаль з СССР) патрабаваў, каб урад згадзіўся ўстанавіць абмежаваны тэрмін сілы законапраекту.

Лідэр лейбарыстаў ЛЕНСБЭРЫ патрабаваў дакладнага адказу, ці застанецца будучы закон у сіле да заключэньня гандлёвай згоды. Ленсбэры лічыць, што за выразы, сказаныя ангельскім паслом у Маскве, нясе адказнасьць ангельскі ўрад. Савецкі ўрад хоча міру і гандлю і ня хоча сварыцца з іншымі краінамі. У заключэньне Ленсбэры патрабаваў, каб урад адмовіўся ад унесенага ім законапраекту.

Міністар гандлю РЭНСІМЭН, падводзячы вынікі спрэчак, заявіў, што ў палаце абшчын усе імкнуцца да справядлівага ўрэгулёваньня гэтай цяжкай справы і што пры ўсім тым нельга ня прымаць пад увагу правоў ангельскіх грамадзян.

Рэзалюцыя апазыцыі аб адхіленьні законапраекту была адкінена большасьцю 347 галасоў супроць 48 і законапраект быў прынят у другім чытаньні. Большасьць членаў лібэральнай групы Самюэля ўстрымалася ад галасаваньня. Законапраект павінен прайсьці астатнія стадыі 6-га красавіка.

Занясеньне сувэрэннасьці правінцыяльных урадаў

БЭРЛІН, 7. Згодна паведамленьняў газэт, лічыць на сёньнішнім пасяджэньні кабінэту, відавочна, будзе зацьверджан новы закон, паводле якога ва ўсіх германскіх правінцыях, за выключэньнем Прусіі, будуць прызначаны намесьнікі, падначаленыя толькі канцлеру. Асноўная прэрагатыва намесьнікаў—назначэньне правінцыяльных урадаў, якія такім чынам ня будуць выбірацца больш ляндтагамі.

Ляндтагі ў далейшым ня змогуць больш выносіць вотумаў недавер'я правінцыяльным урадам, зьмяшчэньне якіх таксама будзе рабіцца намесьнікамі. У Прусіі функцыі намесьніка бу ць належаць канцлеру Гітлеру. Ён назначыць новага прускага прэм'ера, які са свайго боку назначыць рэшту членаў прускага ўраду.

«Дойчэ Альгемэйнэ Цэйтунг» указвае, што роля намесьнікаў у германскіх правінцыях будзе прыблізна адна вядаць ролі губэрнатараў у брытанскіх калёніях і дамініёнах.

Надзвычайныя суды працуюць

БЭРЛІН, 7. Сёньня адбылося першае пасяджэньне берлінскага Вярхоўнага надзвычайнага суда, на якім была разгледжана справа яўрэйскага гандляра Лейстэна, які абвінавачваўся ў распаўсюджваньні чутак пра мны мы прасьледваньні яўрэяў у Германіі. Лейстэн катэгарычна адмаўляў прад'яўленае яму абвінавачваньне. Нарэшце суд прыгаварыў абвінавачаемага да аднаго году турэмнага зьняволеньня.

Учора тры рабочыя прысуджаны да 3-х год катаргі і пазбаўленьня грамадзянскіх правоў на 5 год за тое, што напісалі на сьценах будынкаў камуністычныя лёзунгі.

Фашысты абвяшчаюць 1-е мая днём барацьбы з марксызмам

БЭРЛІН, 7. Нацыянал-сацыялісцкая партыя абвясьціла дзень 1 мая «днём вялікай германскай работы». Гэты дзень павінен праводзіцца пад знакам барацьбы з клясавай нянавісьцю, г. зн. барацьбы супроць марксызму і клясавай салідарнасьці пралетарыяту. Ва ўсёй краіне і асабліва ў Берліне будуць наладжвацца дэманстрацыі і мітынгі.

Баі ў раёне Вялікай сьцяны

ШАНХАЙ, 7. Паводле кітайскіх паведамленьняў кітайскія войскі займаюць порт Цыньзандао (правінцыя Хабэй) і Хайяно (на паўночны захад ад Цыньвандао), контр-атакай прабуючы вярнуць страчаныя ў апошнія дні раёны. У раёне Цзялінкоу (праход Вялікай сьцяны) японцы бесстасьнікова прабуюць перайсьці ў новае наступленьне. Згодна паведамленьня газэты «Сіньвэньбао» з Японіі прыбыла 16-ая дывізія, якая на фронце ў раёне ракі Шыхэ рыхтуецца да новага наступленьня.

***

ШАНХАЙ, 7. Як паведамляе газэта «Шуньбао» рад гарадоў правінцыі Хабэй (Паўночны Кітай) падпаў учора налётам японскай авіяцыі. 2 самалёты бамбардзіравалі горад Фуніпо, скінуўшы каля 20 бомбаў. 8 самалётаў скінулі больш 40 бомбаў у Цзянано (на паўночны захад ад Фуніна), забіўшы 18 і параніўшы 28 жыхароў. Над гарадамі Лулун, Чанлі і Цыньвандао рабіліся налёты разьведачнай авіяцыі. Усяго ў гэтых аэрапланах прымала ўдзел 30 самалётаў.



НА ЗДЫМКУ: Каркас нядаўна зьгінуўшага, буйнейшага ў сьвеце дырыжаблю «АКРОН» у момант зборкі ў эліпцу (ПАЗШ).

„Не здамо тэмпаў на працягу другой пяцігодкі"

МАСКВА — НАРКАМФІНУ СССР ТАВ. ГРЫНЬКО, МЕНСК — ЦК КП(б)Б ТАВ. ГІКАЛО, СНК БССР — ТАВ. ГАЛАДЗЕДУ, НАРКАМФІНУ БССР ТАВ. ХАЦКЕВІЧУ, ГАЗЭТАМ «ЗЬВЯЗДА» І «ЭКОНОМИЧЕСКАЯ ЖИЗНЬ».

РАПАРТ

Пад кіраўніцтвам камуністычнай партыі, у выніку ўдарнай работы і шырокага дастасаваньня сацыялістычных мэтадаў Заснаўшчыне выканала плян мабілізацыі сродкаў першага кварталу 1933 году на 150,1 проц., у тым ліку на добраахвотных плацяжох — на 178,5 проц. і па ашчадкасе — на 189,5 проц.

Перавыконваючы плян мабілізацыі сродкаў бесьперапынна на працягу 6 кварталаў, запэўніваем, што ўзятых тэмпаў не здамо на працягу ўсёй другой пяцігодкі.

Сакратар РК КП(б)Б БЕЛАШЭЎСКІ.
Старшыня райвыканкому ПОШВЭНЧУК.
Загадчык райфа РЫБАСАЎ.

1-га чэрвеня—пуск Крычаўскага цэмэнтнага заводу

Упаўнаважаным Наркамцяжпраму па БССР вызначан тэрмін пуску першага ў БССР цэмэнтнага заводу ў Крычаве — 1 ЧЭРВЕНЯ 1933 г. Прадукцыйнасьць заводу — 720 тыс. бочак, або— 125 тыс. тон портлянцкага цэмэнту ў год.

Завод абсталяван навейшымі машынамі і аўтаматамі. Агульны кошт будаўніцтва каля 12,5 млн. руб. Пры заводзе пабудавана магутная электрастанцыя. Пуск яе адбудзецца 1 мая.

УМОВЫ АГЛЯДУ-КОНКУРСУ СЕТКІ ПАРТЫЙНАЙ АСЬВЕТЫ

У мэтах узьвяцьця марксыцка-ленінскага выхаваньня камуністаў і камсамольцаў на яшчэ большую палітычную вышыню, на ўзровень задач, пастаўленых перад партарганізацыямі пастановамі студзеньскага пленуму ЦК і ЦКК УсеКП(б), лютаўскім і сакавіцкім пленумамі ЦК КП(б)Б, гаркомам партыі з 15 красавіка па 15 мая г. г. праводзіцца агляд-конкурс сеткі партыйнай асьветы.

Асноўнай задачай агляду-конкурсу сеткі партасьветы павінна стаць максымальнае ўзмацненьне ролі сеткі партасьветы ў барацьбе за выкананьне прамфінпляну, за выкананьне плянаў веснавой сяўбы на аснове ажыцьцяўленьня ў сетцы прынцыпу адзінства тэорыі і практыкі, павышэньня клясавай пільнасьці камуністаў, камсамольцаў, рабочых і калгасных мас і мабілізацыі іх на выкананьне пастаноў студзеньскага пленуму ЦК і ЦКК УсеКП(б), лютаўскага і сакавіцкага пленумаў ЦК КП(б)Б.

УМОВЫ АГЛЯДУ-КОНКУРСУ

1. Ахапіць 100 проц. кандыдатаў КП(б)Б палітвучобай.
2. Ахапіць 100 проц. членаў КП(б)Б усімі відамі вучобы.
3. Ахапіць увесь камсамольскі актыў партыйнай асьветай (ня менш 25 проц. усяго складу камсамольскай арганізацыі).
4. Ахапіць ня менш 40 проц. беспартыйнага рабоча-калгаснага актыву сеткай партыйнай асьветы да складу слухачоў партшкол.
5. Павысіць якасьць, ідэалёгічную вытрыманасьць марксыцка-ленінскага выхаваньня, забясьпечыўшы штодзённы кантроль за работаю школ.
6. Забясьпечыць усе партыйныя школы і гурткі памяшканьнямі, падручнікамі, сшыткамі і вытрыманымі, палітычна добра падрыхтаванымі прапагандыстамі.
7. Забясьпечыць пастаноўку ўліку наведваньня заняткаў слухачамі, узмацніўшы кіраўніцтва школамі, не дапускаючы зрыву заняткаў сходамі і пасяджэньнямі.
8. Партыйным калектывам і ячэйкам, шэфствуючым над сельсаветамі і калгасамі, дапамагчы вясковым ячэйкам у правядзеньні агляду-конкурсу, шляхам пасылкі брыгад, літаратуры і г. д.

УМОВЫ ДЛЯ АСОБНЫХ ШКОЛ І ГУРТКОЎ

1. Дабіцца 100-проц. замацаваньня слухачоў у школах і гуртках да канца навучальнага году (г. зн. да скан'эньня прапрацоўкі прапрамных пытаньняў), забясьпечыўшы арганізаваны пераход работы школ на летнія формы вучобы.
2. 100-проц. наведваньня заняткаў, ні аднаго зрыву заняткаў.
3. Забясьпечыць увязку тэорыі з практыкай (удзел школ, гурткоў у барацьбе за выкананьне прамфінпляну, пасеўных плянаў і г. д.).
4. Кожны слухач партшколы — ударнік на вытворчасьці.
5. Сыстэматычна асьвятляць (не раздзей аднаго разу ў дэкаду) работу школы-гуртка ў насьценгазэце, шматтыражцы і ў цэнтральным друку.

УМОВЫ ДЛЯ СЛУХАЧА

1. Ні аднаго пропуску заняткаў.
2. Лепшая падрыхтоўка да заняткаў.
3. Актыўны ўдзел у партыйна-грамадзкай рабоце ячэйкі, партгрупы, цэху, брыгады і калгасу.
4. Актыўны ўдзел у рабоце школы і гуртка.
5. Кожны слухач партыйнай школы—рабкор.

УМОВЫ ДЛЯ ПРАПАГАНДЫСТАЎ

1. Ні аднаго спазьненьня і пропуску заняткаў.
2. Дасканалая падрыхтоўка да заняткаў.
3. Увязка агульна-палітычнага матар'ялу, што прапрацоўваецца ў школе, з задачамі заводу, цэху, зьмены, калгасу.
4. Актыўны ўдзел прапагандыста ў пастаноўцы марксыцка-ленінскага выхаваньня на прадпрыемстве.
5. За лепшае правядзеньне агляду-конкурсу, за лепшую пастаноўку партыйнай вучобы, за лепшы мэтад выкладаньня і пастаноўкі ўліку — устанавіць наступныя прэміі:

ДЛЯ ПАРТКАЛЕКТЫВАЎ І ЯЧЭЕК:

Першая прэмія — пераходны сьцяг раркому партыі, 250 руб. на бібліятэку і адна пуцёўка на курортнае лячэньне.

Другая прэмія — 200 руб. на партыйную бібліятэку, 2 пуцёўкі ў дом адпачынку.

ДЛЯ ПРАПАГАНДЫСТАЎ:

Першая прэмія — адна пуцёўка на курортнае лячэньне й 50 руб. на літаратуру.

Другая прэмія — (5) пуцёўкі ў дамы адпачынку на два тыдні, літаратура на 25 руб. й граматы.

ДЛЯ СЛУХАЧОЎ

Дзесяць пуцёвак у дамы адпачынку на два тыдні, шасьцітомнік Леніна, «Пытаньні ленінізму» Сталіна, бюст Леніна, падпіска да канца году на газ. «Зьвязда», «Праўду», граматы.

Па БССР

Па рэках Беларусі пачаўся сплаў

ВІЦЕБСК. На радзе вучасткаў — Полацкім, Бешанковіцкім і Лепельскім — пачаўся сплаў.

З вярхоўя ракі Эсы праз Краснаўкі да Барысава ідзе 4.000 кбм. лесу, зьвязанага ў плыты. Мо ляўным сплавам на рацэ Эсе да Лепеля ідзе 4.500 кбм. дроў. Па рацэ Лукомля адпраўлена да Лепеля 1.000 кбм. будаўнічага лесу і 5.500 кбм. дроў ідзе молем. Са Старобі. на плыве 1.000 кбм., зьвязаных у плыты. Усяго пушчана ў сплаў 16.000 кбм. драўніны.

Рабочай сілай сплаў больш-менш забясьпечан. Працуе 102 сплаўшчыкі, арганізаваныя ў 16 брыгад. Харчы завезены ў Краснаўкі, Чашнікі і на іншыя вучасткі.

Лепшыя паказальнікі ўдарнай работы паказвае брыгада Канчаўскага Данілы, Струве і жаночая брыгада Пішкі, працуючая на скацы лесу. Гэтыя брыгады значна перавыконваюць свае нормы.

Зарубежны, Стэрнін.

Антыпасхальная кампанія

З 1 па 25 красавіка Саюз ваяўнічых бязбожнікаў БССР праводзіць антыпасхальную кампанію. На фабрыках, у калгасах, саўгасах арганізуюцца новыя ячэйкі бязбожнікаў, узмацняецца работа старых ячэек.

Рад работнікаў выяжджае ў раёны БССР — Дрыса, Дуброўну, Барысаў, Бабруйск, Мазыр, Дзяржынск, Капыль, Крупкі для прачытаньня дакладаў, лекцый на антырэлігійныя тэмы. Выяжджаючых забясьпечваюцца бібліятэкамі.

Цэнтральны савет бязбожнікаў выпусьціў і разаслаў па райсаветах макет антыпасхальнай насьценнай газэты на яўрэйскай мове, ў колькасьці 10 тыс. экземпляраў. Адначасова выпускаецца брашура пад назвай «Клясавая сутнасьць вялікадня». Ячэйкамі, райсаветамі і клюбамі арганізуюцца экскурсіі ў антырэлігійныя музэі.

Дэкаднік паказальнай рэвізіі букс

ВІЦЕБСК. (Па тэлеграфу).

Рабочыя вагоньнікі і дэпо Віцебск. абмеркоўваўшы пачын рабочых Маскоўска-Курскай чыгункі, абвясьцілі дэкаднік паказальнай запраўкі і суцэльнай рэвізіі букс. Дэкаднік праводзіцца з 6 па 16 красавіка.

ХРОНІКА

✱ Гастролі артысткі Сары Фібіх арганізуюцца па БССР Дзяржаўнай украінскай філармоніяй разам з БелДАМЭЦ'ам.

✱ 46.800 пар рознага летняга абутку —парусінавага, сандаляй, чувякоў і т. д. будзе завезена ў БССР ў другім квартале.

✱ 2 млн. руб. будзе ўкладзена ў 1933 годзе на рамонт дамоў менскіх жактаў. Вызначан рамонт 456 дамоў.

✱ Новая мэханічная пральня ў Менску будзе пушчана ў бягучым квартале.

✱ Да дня аховы птушак Віцебскі дзяржаўны этнаалёгічны музэй адкрыў выстаўку «Аховa карысных птушак».

✱ Куставыя зьлёты конюхаў-калгаснікаў адбыліся ў трох пунктах Аршанскага раёну — Ворпы, Смальнях і Багушэўску.

✱ На ўсесаюзныя фізкультурныя спаборніцтвы «Дынамо», якія адбудуцца ў красавіку ў Харкаве, з БССР выяжджае 15 лепшых фізкультуршчыкаў-гімнастаў.

✱ На сканчэньне будаўніцтва новай пазьні ў Гомелі адпушчана 160 тыс. рублёў.

✱ З 5 па 15 красавіка камсамол Беларусі праводзіць усебеларускі агляд калгаснай і саўгаснай стайні.

✱ Усебеларуская нарада па пытаньнях драматургіі склікаецца аргкамітэтам СОПБ у Менску, 15 красавіка.

Адказны рэдактар Г. Н. БРАГІНСКІ.

Рэдакцыя газэты „ЗЬВЯЗДА" СЁНЬНЯ, 9 КРАСАВІКА СКЛІКАЕ НАРАДУ АБ ПАДРЫХТОЎЦЫ ДА БУДАЎНІЧАГА СЕЗОНУ

На нараду павінны зьявіцца з падрыхтаванымі матар'валамі: кіраўнікі або іх намесьнікі: Белдзяржбуду, будаўнікоры Дзяржпляну, Белбудматар'ялу, будкамісары прыБелжылсаюзе, будсэктару Камунбанку, дырэктары менскіх цагелень і рэдактары шматтыражак і насьценгазэт памянёных устаноў.

Нарада адбудзецца 9-IV—33 г. в 6 гадз. у памяшканьні рэдакцыі. (Савецкая, 63, 3-ці паверх, прамысловы сэктар).

10-га КРАСАВІКА, у 8 гадзін вечара, у памяшканьні клюбу гарсавету (пляц Волі, 4) адбудзецца

СХОД УСІХ ЗАГАДЧЫКАЎ ДАМАМІ

гаржылсаюзу, жылтрэсту, камэндантаў устаноў і дворнікаў гор. Менску.

На сход павінны зьявіцца прадстаўнікі самагляду і аддзелу дабрабыту гораду.

Аргмасавы Аддзел Менгарсавету.

Чырв. Зорка Каса—ад 1 г. дня. Новы гукавы фільм КАІН І АРЦЁМ

Дзіцячы гукавы КІНО-ТЭАТР Каса з 12 г. дня. З 1 красавіка новы мастацкі фільм РАЗАМ з БАЦЬКАМІ

„ІНТЭРНАЦЫЯНАЛ" Каса—з 2 г. дня ЗАКОН І АБАВЯЗАК (АМОК) драма ў 6 ч.

ПРАЛЕТАРЫ Мастацкі фільм КНЯЗЕУН А МЭРЫ драма ў 8 ч.

„СПАРТАК" Каса—ад 2 г. 30 х. Зам'ежны мастацкі фільм ДЭЗЫЧЫНА-БЯЗБОЖНІЦА драма ў 10 часьцях.

Першы Дзярж. Тэатр (БДТ-1) СЁНЬНЯ МОСТ ПАЧАТАК у 8 гада. веч.

Абвяшчаецца дадатковы набор на аднагадовыя КУРСЫ АПТЭЧНЫХ ТЭХНІКАЎ.

На курсы прымаюцца асобы з адукацыяй ня менш 4-5 годы.

Заявы з дакумантамі аб асьвеце, узросьце, сацыяльным і матар'яльным становішчы прымаюцца да 15-IV 33 г.

Курсанты на 50 проц. забясьпечваюцца стыпендыяй.

Заявы накіроўваць: г. Магілеў, БССР, Медыцынтэхнікум.

Дырэкцыя.

Чавускае аддзяленьне Дзяржбанку

даводзіць да ведама ўсіх устаноў і арганізацый, што за неаплату рахункаў-фактур

ПРАДАЮЦЦА

тавары Чавускага райсаюзу:

1. Мануфактура розная на 6886 руб.
2. Жалезная розная пасуда на 8044 руб.
3. Гатовая розная вопратка на 8586 руб.
4. Абутак розны на 3390 руб.
5. Канфеты і інш розныя тавары на 19981 р.

Тавары прадаюцца толькі сацыялістычнаму сэктару.

За ўсімі даведкамі зварочацца ў плянавую частку Чавускага аддз. Дзяржбанку.

Чавускае аддз. Дзяржбанку.

Зг одна пастановы ўрэўдуду с ад 31-3-33 г., з якога тэрміну ўся маемасьць, тавары, матар'яльныя і іншыя каштоўнасьці перайшлі да новаарганізаванага аддзелу рабочага снабжэньня Барысаўскага лесапрамгасу (АРС).

Установы і асобы па ўсіх нясканчаных разьліках і прэтэнзіях да лесрабкопу павінны зварочацца да 20 красавіка 1933 г., пасьля якога тэрміну ніякія прэтэнзіі прымацца ня будуць.

Інкідном леорабкопу.

Аб выбарах акадэмікаў Беларускай Акадэміі Навук

Прэзыдыум Беларускай Акадэміі Навук паведамляе, што 22-га МАЯ 1933 г. склікаецца

СЭСІЯ АКАДЭМІІ,

на якой будуць зроблены выбары новых акадэмікаў:

1. Абвяшчаюцца выбары 7-мі акадэмікаў у галіне грамадзавечных, прыродазнаўчых і тэхнічных навук.
2. У акадэмікі Беларускай Акадэміі Навук выбіраюцца прадстаўнікі навукі, тэхнікі або мастацтва, якія ўзбагацілі навуку, тэхніку або мастацтва працамі, асабліва выдатнага значэньня, якія накіроўваюць сваю дзейнасьць на карысьць сацыялістычнага будаўніцтва.
3. Кандыдаты ў акадэмікі Беларускай Акадэміі Навук вылучаюцца навуковымі, установамі, вышэйшымі школамі, грамадзкімі арганізацыямі, пасобнымі вучонымі і групамі іх.
4. Установы, арганізацыі і асобы, якія высоўваюць кандыдатаў у акадэмікі, прадстаўляюць у Беларускую Акадэмію Навук наступнае: а) жыцьцяпіс высунутага кандыдата, б) яго характарыстыку, в) навуковыя працы.
5. Апошнім тэрмінам прадстаўленьня кандыдатаў устанавляецца 5-га МАЯ 1933 г.
6. Сьпіс высунутых кандыдатаў публікуецца ў друку для шырокага грамадзкага абмеркаваньня.

Прэзыдэнт Беларускай Акадэміі Навук П. ГОРЫН.
Неадменны сакратар ПАНКЕВІЧ.

АБ'ЯВА АБ РЭГІСТРАЦЫІ

Народным Камісарыятам Фінансаў БССР

7 красавіка 1933 г., на падставе арт. 2-4 цалаж. аб дзяржаўнай рэгістрацыі ад 9-II-1931 года (збор законаў і загадаў СССР № 8, пост. 99)

ЗАРЭГІСТРАВАНЫ

Ў РЭЕСТРЫ ЮРЫДЫЧНЫХ АСОБ ПАД № 138 (СТО ТРЫЦЦАЦЬ ВОСЬМЫМ)

СТАТУТ БЕЛАРУСКАГА ДЗЯРЖАЎНАГА ТРАНСПАРТНАГА ТРЭСТУ АЎТА-ГУЖАВОЙ, СКЛАДСКОЙ І ТРАНСПАРТНА-ЭКСПЭДЫЦЫЙНАЙ СПРАВЫ

„БЕЛДЗЯРЖТРАНСУ"

АДРАС кіраўніцтва трэсту: гор. Менск, Масюўская, 3.

АДДЗЯЛЕНЬНІ ТРЭСТУ ЗНАХОДЗЯЦЦА Ў НАСТУПНЫХ ГАРАДОХ: МЕНСКУ, ВІЦЕБСКУ, ГОМЕЛІ, МАГІЛЕВЕ, БАБРУЙСКУ, ВОРШЫ, ПОЛАЦКУ, БАРЫСАВЕ, РЭЧЫЦЫ, СЛУЦКУ І МАЗЫРЫ.

Разьліковы рахунак кіраўніцтва трэсту ў Беларускай канторы Дзяржбанку № 136-265.

НАРКАМФІН БССР.

БЕЛКАНТОРА ДЗЯРЖБАНКУ

даводзіць да ведама ўсіх гандлёвых (купляючых тавары арганізацый), што ДЗЯРЖБАНКАМ ПРАДАЮЦЦА наступныя тавары:

з-за адсутнасьці грошай:

НАЗВА ТАВАРАЎ	СУМА	НАЛЕЖАЧЫЯ
Хустки, трыко	19.775 р.	Белпрамгандлю
Машыны фрэзэрн.	1.569 „	„
Шкіпінар	42.109 „	Арц. „Уперад"
Сьпірт драўнінны	5.610 „	„
Саляровае масла	2.097 „	„
Вераценае масла	8.511 „	„
Дошкі саснов.	1.520 „	„
Ахлопак	2.010 „	Арц. «Чырв. ўцільшчык»
Гатовае адзеньне	75.172 „	Белзбытштушніна
Шапкі мехавыя	55.175 „	„
Плёнкі	2.607 „	Арц. «Новы шлях»
Сані сялянскія	32.656 „	Самгасаб'яднаньне
Смала драўл.	7.764 „	„
Лён-сырэц	1.629 „	Загатлён
Аўта чашына	8.600 „	Добраахв. пажарнае т-ва
Зубаўрач. інстр.	1.140 „	Аптэкакіраўніцтва
Касмэтыка	1.979 „	„
Апаратура розн.	23.961 „	„
Мэдыкамэнты	24.074 „	„
Провад і балванкі	9.522 „	Арц. „Сірэна"
Такарны варштат па мэталу	7.713 „	завод лавцут. „Галя"
Сталёвае ліцьцё	9.936 „	завод імя Варашылава
Фаянс. пасуда	24.385 „	Шклофарфарзбыт

Адмова ад акцэптаў

НАЗВА ТАВАРАЎ	СУМА	НАЛЕЖАЧЫЯ
Лапці	16.424 р.	База БКС
Спатры мастацк.	3.366 „	„
Сеткі жалезныя	1.629 „	„
Валёнкі мум.	2.879 „	„
Лапаты і тапары	1.883 „	„
Крэслы венскія	7.403 „	Магаз. № 1 БКС
Шчоткі для падлогі	77.610 „	Саюзвакупгандаль
Ахлопак	2.856 „	Арц. „Чырв. ўцільшчык"
фаянс. вырабы	3.972 „	Аптэкакіраўніцтва
Сталь	12.772 „	Белдзяржснаб
Масьляныя ванны	1.148 „	Аптэкакіраўніцтва
Эмалевая фарба	8.944 „	Снаб. БКС
Драўляныя надушкі	5.000 „	„Чырвоны волак"
Мун. і дзіцяч. вален. абутак	1.569 „	Белпрамгандаль
Жалеза квадратов.	3.906 „	Завод „Камунар"
Каўняры цыгейкі	12.926 „	фабрыка „1 мая"
Асб.-цэм. трубы	4.067 „	Белпрамхлеб
Электрапрылады	2.522 „	ВЭА
Падковы конныя	16.951 „	БСГ Снаб.

Зварачацца ў таварны аддзел Дзяржбанку.

Усебел. к-ра Дзяржбанку.

Францыя адмаўляецца ад далучэньня да пакту чатырох дзяржаў

ПАРЫЖ, 7. Як паведамляе агенцтва «Гавас», Далад'е ў сваёй прамове ў палаце дэпутатаў заявіў, што «адмаўляецца далучыцца да дырэктары чатырох вялікіх дзяржаў, якая наклала-б сваю волю астатняму сьвету, падобна да былога «сьвяшчэннага саюзу».

«Новы пакт павінен быць лёгічным працягам статуту Лігі нацый у цэлым, пакту Келлога і Локарнскага пакту, якія гарантуюць недатыкальнасьць францка-германскай граніцы і іспаванні ім дэмілітарызаванай зоны. Францыя ня можа адмовіцца ад гэтых дагавораў.

Можна баяцца, што слова «рэвізія» самаскую зусім рэальныя імкненьні і можа выклікаць пенакой у некаторых народаў перад абуджэньнем нацыяналізму ў некаторых краінах».

Далад'е ў сваёй дэкларацыі, закранаючы брытанскі праект канвэнцыі па разьбраеньні, між іншым, заявіў: «Зразумела, мы хочам, каб гэты плян быў дапоўнен ясным і дакладным вызначэньнем нападаючага боку, якое Расія мела заслугу прадставіць і якое было намі ўхвалена».

Выступіўшы ў палаце ў спрэчках па бюджэту міністэрства замежных спраў Франклен Буён заявіў, што ў пакцэ чатырох дзяржаў справа ідзе аб тым, каб пры дзяржавы прымусілі чацьвертую згадзіцца на рэвізію дакаваў, што азначае трабеж саюзнікаў Францыі. Зрыё заявіў, што цалкам далучаецца да заявы Далад'е, але праводзіць вялікую розьніцу паміж ангельскім праектам і рымскім. Пры гэтым Зрыё дадаў, што «праект Мусаліні зусім ужо на той, якім ён быў два тыдні назад. Мы ня можам яго прыняць». Зрыё адзначыў таксама, што паміма чатырох вялікіх дзяржаў існуе яшчэ па-за Эўропай Амэрыка, і задаў пытаньне: навошта запрошчаць дзьверы для супрацоўніцтва СССР? У заключэньне Зрыё вітае ўрад за тое, што ён застаецца верным палітыцы Лігі нацый.

Пакт чатырох дзяржаў—гэта разбурэньне Лігі нацый

Заява міністра Бэнэша

ВАРШАВА, 7. Польскае тэлеграфнае агенцтва паведамляе: «У інтэрв'ю, даным супрацоўніку «Кур'ера поранніга» ў Празе, Бэнэш заявіў, што немагчыма перашкодзіць заключэньню пакту чатырох дзяржаў, але ён ня бачыць матываў супроць стварэньня Польшчай і Малай Антантай «клюбу малых краін». Калі ў пакце будуць закрануты пытаньні, якія цікавяць Чэха-Славакію, або калі Ліга нацый ухваліць працэдуру пакту (ў галіне рэвізіі Вэрсальскага практату), Бэнэш проста пакіне Лігу, пазбаўленую ўсякага сэнсу існаваньня. Да гэтага Бэнэш дадаў, што адны і тыя-ж інтарэсы зьвязваюць Польшчу і Чэха-Славакію. У заключэньне Бэнэш падкрэсьліў, што калі пакт будзе падпісан, «Ліга нацый будзе разбурана».

ПАРЫЖ, 6. «Гавас» паведамляе з Брусэлю, што сэнацкая камісія па замежных справах пацьвердзіла сваю вернасьць стапуту Лігі нацый і заявіла пратест супроць стварэньня дырэкторыі 4-х дзяржаў

Катастрафічнае становішча германскіх фінансаў

Курс маркі бязупынна зьніжаецца

ПАРЫЖ, 6. Марка сёньня катыравалася ў 6,015 франкаў супроць 6,03 на 5 красавіка і 6,05 на 4 красавіка. «Энфармасьен» тлумачыць падзеньне маркі ўзносам рэйхсбанкам 70 млн. далараў у пагашэньне свайго кратыту пры адначасовым бесьперапынным росьце паперовага звароту ў краіне, які перавысіў 3.500 млрд. марак.

Другой прычынай зьніжэньня курсу газэта лічыць выраз загрэніцу капіталаў нямецкімі капіталістамі, якія нелегальна пераходзяць граніцу. Так, у швэйцарскіх банках нагромадзіцца падлыў патрабаваньняў на зварот марак